Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 160 (5834) | 14 ліпеня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Героі Сталінскай эпохі—адважныя лётчыкі Громаў, Юмашоў і Данілін на самалёце „АНТ-25" праляцелі Паўночны полюс і зараз нясуцца над прасторамі Паўночнай Амерыкі.

40 тысяч фізкультурнікаў 11 саюзных рэспублік на Краснай плошчы ў Маскве дэманстравалі сваю сілу, адвагу, гарачую любоў да радзімы і бязмежную адданасць вялікаму Сталіну.

НА ТРАСЕ ГЕРОЯЎ

Увесь Совецкі Саюз з хваляваннем прачытаў паведамленне Урадавай камісіі:

«Урад задаволіў хадайніцтва Героя Совецкага Саюза тав. М. М. Громава, маёра А. Б. Юмашэва і ваенінжынера трэцяга ранга С. А. Даніліна аб дазволе ім беспасадачнага пералёту па маршруту Масква—Паўночны полюс—Паўночная Амерыка. Старт быў дадзен 12 ліпеня 1937 года, у 03 гадзіны 21 мінуту са Шчолкаўскага аэрадрома ля Масквы...»

Адважны экіпаж самалёта «АНТ-25» Герой Совецкага Саюза М. М. Громаў, А. Юмашэў і С. Данілін накіраваліся ў далёкі шлях, каб заваяваць чалавецтву новую паветраную лінію.

Пачаўся новы беспасадачны пералёт па Сталінскай трасе — з Масквы ў Амерыку праз Паўночны полюс.

Увесь свет зноў пільна сочыць за чырвонакрылай птушкай, якая смела і настырмна нясецца наперад праз незведаныя прасторы, праз моры і акіяны, праз бязмоўныя ледзяныя пустыні Арктыкі.

Доблесныя лётчыкі — сталінскія сокалы Чкалаў, Байдукоў і Белякоў—пасля трыумфальнай сустрэчы ў Злучаных Штатах Амерыкі рыхтуюцца да звароту ў родную краіну. Ім на змену нясецца новая тройка адважных сокалаў.

Па легендарнай трасе, пракладзенай героямі, ляціць другая птушка, яна нясе на сваіх крыллях усяму свету вестку аб новай перамозе совецкай авіяцыі, совецкай тэхнікі і навукі.

Свет яшчэ раз даведаецца, што героі Арктыкі—у нас не адзіночкі, што ў нашай краіне ёсць шмат людзей, здольных на вялікія справы, на вялікія подвігі. Партыя Леніна—Сталіна выхоўвае тысячы адважных, смелых арлоў. Усе яны лічаць для сябе шчасцем і гонарам выканаць заданне партыі і ўрада, заданні вялікага Сталіна, мацаваць магутнасць Совецкага Саюза, разносіць па ўсяму свету славу аб ім.

Таварышы Громаў, Юмашэў і Данілін ляцяць на Поўнач праз тры тыдні пасля вылету першай тройкі адважных герояў. Гэтым палётам яны дэманструюць той няўхільны факт, што найтруднейшы пералёт па невядомаму шляху можа быць у нашых умовах паўторан у любы момант другой групай совецкіх лётчыкаў, што большэвікі не ведаюць перашкод у дасягненні сваёй мэты

Яны даказваюць свету, што гонар асваення першай у гісторыі чалавецтва трансполярнай лініі па праву належыць краіне Советаў, што гэты гонар не адняць нікому.

Экіпаж «АНТ-25» даказвае ўсяму чалавецтву, што поспехі совецкіх пілотаў не з'яўляюцца «выпадковай удачай», што гэтыя поспехі забяспечаны высокай тэхнікай нашай краіны, нястомнымі клопатамі нашага ўрада, комуністычнай партыі і вялікага Сталіна.

Сваім палётам тройка герояў падымае на недасяжную вышыню справу прагрэса і цывілізацыі, магутным аплотам якіх з'яўляецца Совецкі Саюз.

У пісьме да таварыша Сталіна слаўны экіпаж «АНТ-25» піша:

«Шлях Масква—Паўночны полюс—Злучаныя Штаты Амерыкі будзе асвоен совецкімі лётчыкамі і ператвораны у нармальную лётную трасу нашай авіяцыі. У гэтым мы цвёрда пераконаны, ніякія небяспекі і труднасці не пахіснуць нашай упэўненасці.

Гэта наша ўпэўненасць пакоіцца на мацнейшым фундаменце жыццёвых фактаў: нашы машыны выдатныя, нашы маторы выносліывя, нашы прыборы дакладныя, нашы лётчыкі, узрошчаныя партыяй, узрошчаныя Вамі, таварыш Сталін, маюць усе неабходныя якасці для таго, каб лятаць далей, быстрэй і вышэй за ўсіх.

Мы не будзем адзінокі ў гэтай барацьбе са стыхіяй, як не былі адзінокі Шмідт, Водап'янаў, Папанін, як не былі адзінокі Чкалаў, Белякоў, Байдукоў. За намі стаіць вялікі народ свабоднай і шчаслівай Совецкай краіны, за намі стаіць магутная партыя Леніна—Сталіна, за намі стаіце Вы, таварыш Сталін, лепшы друг лётчыкаў, наш бацька і настаўнік.

Мы горды Вашым даручэннем. Мы абяцаем Вам і ўсёй нашай радзіме, што выканаем свой абавязак так, як належыць выконваць абавязак байцам рэволюцыі. Гонар вялікай краіны і вялікага народу валодае нашымі сэрцамі і нашымі пачуццямі.

Гарачае прывітанне, чарагі таварыш Сталін!

Экіпаж «АНТ-25»:

ГРОМАЎ,
ЮМАШЭЎ,
ДАНІЛІН.

12 ліпеня ў Маскве на Краснай плошчы адбыўся Усесаюзны парад фізкультурнікаў, прысвечаны 20-годдзю Вялікай пролетарскай рэволюцыі і прыняццю Сталінскай Канстытуцыі. НА ЗДЫМКУ: кіраўнікі партыі і ўрада на трыбуне маўзалея (справа налева): тт. Ежоў, Молатаў, Калінін, Сталін, Мікаян, Варашылаў, Жданаў, Дзімітраў, Андрэеў, Л. М. Кагановіч і Хрушчоў.

Фото Ф. Кіслова (СФ).

ЭКІПАЖ „АНТ-25" тт. ГРОМАЎ, ЮМАШОЎ, ДАНІЛІН— *таварышу СТАЛІНУ*

Дарагі таварыш Сталін! Мы адпраўляемся ў далёкую дарогу, каб выканаць Ваша заданне. Гэта напаўняе нашы сэрцы гордасцю і радасцю. Гэта ўсяляе ў нас сілу. Гэта памнажае нашу энергію. Рулі выдатнай совецкай машыны, зробленай на совецкім заводзе рукамі совецкіх рабочых, пакорны нашай волі. Мы накіроўваемся следам за доблеснымі Чкалавым, Байдуковым і Беляковым і прыкладзем усе стараннi для таго, каб у слаўным социялістычным спаборніцтве перакрыць іх паказальнікі.

Шлях Масква—Паўночны полюс—Злучаныя Штаты Амерыкі будзе асвоен совецкімі лётчыкамі і ператвораны у нармальную лётную трасу нашай авіяцыі. У гэтым мы цвёрда пераконаны, і ніякія небяспекі і труднасці не пахіснуць нашай упэўненасці.

Гэта наша ўпэўненасць пакоіцца на мацнейшым фундаменце жыццёвых фактараў: нашы машыны надзвычайныя, нашы маторы выносліывя, нашы прыборы дакладныя, нашы лётчыкі, узрошчаныя партыяй, узрошчаныя Вамі, таварыш Сталін, маюць усе неабходныя якасці для таго, каб лятаць далей, быстрэй і вышэй за ўсіх.

Мы не будзем адзінокі ў гэтай барацьбе са стыхіяй, як не былі адзінокі Шмідт, Водап'янаў, Папанін, як не былі адзінокі Чкалаў, Белякоў, Байдукоў. За намі стаіць вялікі народ свабоднай і шчаслівай Совецкай краіны, за намі стаіць магутная партыя Леніна—Сталіна, за намі стаіце Вы, таварыш Сталін, лепшы друг лётчыкаў, наш бацька і настаўнік.

Мы горды Вашым даручэннем. Мы абяцаем Вам і ўсёй нашай радзіме, што выканаем свой абавязак так, як належыць выконваць абавязак байцам рэволюцыі. Гонар вялікай краіны і вялікага народу валодае нашымі сэрцамі і нашымі пачуццямі.

Гарачае прывітанне, чарагі таварыш Сталін!

Экіпаж «АНТ-25»:

ГРОМАЎ,
ЮМАШЭЎ,
ДАНІЛІН.

Родны наш таварыш СТАЛІН!

Сабраўшыся на мітынг, прысвечаны 17-й гадавіне вызвалення БССР ад белапалякаў, мы, працоўныя горада Менска, шлем Вам, свайму любімаму правадыру, настаўніку і другу наша гарачае большэвіцкае прывітанне.

Пад кіраўніцтвам нашай слаўнай большэвіцкай партыі, пад Вашым асабіста, дарагі таварыш Сталін, кіраўніцтвам, пры актыўнай дапамозе рускага рабочага класа працоўныя БССР 17 год таму назад разграмілі германскіх і польскіх акупантаў і заверхзілі ўладу рабочых і сялян.

За гэтыя гады БССР, дзякуючы Вашай несупыннай дапамозе і клопатам, дабіліся найвялікшых поспехаў на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва, ператварылася ў квітнеючую ордэнаносную рэспубліку, несакрушальны баявы фарпост нашай социялістычнай радзімы на заходніх границах.

Сёння ў гэта вялікае ўсенароднае свята мы разам з усім Совецкім Саюзам дэманструем трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, вялікую дружбу і несакрушальнае брацтва народаў Совецкага Саюза, гарачую любоў і беззаветную адданасць сваёй социялістычнай радзіме, сваёй большэвіцкай партыі, любімаму правадыру і другу таварышу Сталіну.

Вялікая Совецкая Канстытуцыя і новы социялістычны выбарчы закон, творцом якіх з'яўляецеся Вы, наш дарагі таварыш Сталін, натхняюць усіх нас на далейшую барацьбу за ўмацаванне справы социялізма ў нашай краіне.

Заклятыя ворагі народу — япона-германа-польскія трацкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія шпіёны і бандыты прабавалі адарваць Совецкую Беларусь ад СССР, рэстаўраваць капіталізм, ператварыць нашу квітнеючую і шчаслівую радзіму ў калонію германа-польскага фашызма.

Мы, працоўныя горада Менска, запэўняем Вас, дарагі таварыш Сталін, што мы да канца будзем бязлітасна граміць, выкарчоўваць і знішчаць з твару совецкай зямлі подлых бандытаў, гнуснейшых агентаў фашысцкіх разведак. Ніякай белагвардзейскай і фашысцкай гадзіне не ўдасца больш топтаць зямлю Совецкай Беларусі!

Узброеныя Вашымі мудрымі ўказаннямі, дадзенымі на лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) і рашэннямі чэрвеньскага Пленума ЦК ВКП(б), — мы будзем несупынна ўзнімаць сваю рэволюцыйную пільнасць, будзем авалодваць большэвізмам для таго, каб умець распазнаваць ворага, якой-бы маскай ён ні прыкрываўся, і бязлітасна разіць яго.

Мы ні на хвіліну не забываем ваша ўказанне аб капіталістычным акружэнні. Мы будзем зорка ахоўваць граніцы нашай социялістычнай радзімы ад палкопаў ворагаў, будзем несупынна ўмацоўваць абароназдольнасць нашай краіны, сілу і магутнасць нашай Чырвонай Арміі, будзем авалодваць ваеннымі ведамі для таго, каб у кожную хвіліну даць сакрушальны адпор ворагу, які папрабуе парушыць граніцы совецкай зямлі.

Мы запэўняем Вас, таварыш Сталін, што БССР, як неадрыўная, састаўная частка вялікага Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, будзе і ў далейшым баявым несакрушымым фарпостам на заходніх рубяжах нашай неабсяжнай любімай социялістычнай радзімы.

І калі патрэбуецца, беларускі народ на першаму заклику партыі і ўрада, увесь як адзін, устане на абарону здабыванняў социялізма, справы Леніна—Сталіна, за якую мы гатовы аддаць усё сваё жыццё.

Няхай жыве наша слаўная большэвіцкая партыя і яе сталінскі Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве наш рабоча-сялянскі ўрад!

Няхай жыве правадыр народаў, любімы настаўнік і друг, наш родны таварыш Сталін!

ДЭМАНСТРАЦЫЯ МАЛАДОСЦІ, АДВАГІ, ЛЮБВІ ДА РАДЗІМЫ

З незвычайным бляскам, яркa і таленавіта прайшоў учора ў Маскве, стаўшы ўжо традыцыйным, фізкультурны парад. Ён увянчаў сабой пялую паласу развіцця совецкай фізкультуры, наглядна і пераканаўча паказаў, якую выдатную, квітнеючую, таленавітую і фізічна здаровую, бязмежна адданую справе Леніна—Сталіна моладзь мае наша краіна. Перад кіраўнікамі партыі і ўрада, стаханаўцамі і стаханаўкамі маскоўскіх фабрык і заводаў, прадстаўнікамі гераічнай рэспубліканскай Іспаніі прайшлі дзесяткі тысяч совецкіх юнакоў і дзяўчат, чыя шчаслівая юнасць складае прадмет пястомных бацькаўскіх клопатаў таварыша Сталіна, рабоча-сялянскага ўрада і ўсяго нашага народу.

Мінуў толькі год з часу апошняга фізкультурнага парада, але тое, што было ўчора паказана на Краснай плошчы, лепш усякіх лічбаў гаворыць аб тым, як быстра расце наша краіна, якімі невычарпальнымі крыніцамі талентаў і дараванняў яна ўладае. Год, прайшоўшы пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, быў годам яшчэ большага росквіту народаў шматнацыянальнага Совецкага Саюза, і фізкультурнае свята паказала гэта асабліва ярка.

Незабываемымі астануцца выступленні фізкультурнікаў Саюзных Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Перад глядачамі як-бы разгарнулася ўся краіна, і яны адчувалі, як у любым кутку краіны, як-бы далёк ён ні быў, кіпіць творчая праца, ствараецца надзвычайны чалавечы матэрыял, роўнага якому няма ў свеце. Калоны фізкультурнікаў дзвінапаці саюзных рэспублік былі ўвасабленнем Сталінскай Канстытуцыі, узняўшай народы Совецкага Саюза на нябачаную вышыню. Доўга астануцца ў памяці ўмелыя выступленні і майстэрства рускіх, украінцаў, беларусоў, азербайджанцаў, грузін, армян, узбекаў, туркменаў, таджыкаў, казахаў, кіргізаў. Ці-ж не хвалюе, напрыклад, выступленне дзяўчат Узбекістана, дзе яшчэ зусім нядаўна жанчыны хадзілі закрытыя параньджою? Ці яркае і красачнае выступленне беларускіх фізкультурнікаў?!

Людзі з моцнымі мускуламі і яснай галавой яўлялі жывы прыклад непарушнай дружбы і брацтва народаў нашай радзімы. Яны прынеслі сюды, на Красную плошчу, словы ўдзячнасці і любві вялікаму другу і настаўніку прапоўных усяго свету таварышу Сталіну. Перад яго тварам яны дэманстравалі плады ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечыла росквіт талентаў і культуры народаў.

Учарашні фізкультурны парад быў не толькі паказам поспехаў і дасягненняў совецкіх спартсменаў, але і буйнейшай палітычнай дэманстрацыяй адзінства і згуртаванасці народаў Совецкага Саюза вакол вялікага і непераможнага сцяга Леніна — Сталіна. Гэта была дэманстрацыя адданасці народаў Совецкага Саюза Сталінскаму Цэнтральнаму Камітэту, ураду першай у свеце социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Аб'яднаныя комсамолам, совецкія фізкультурнікі, уся совецкая моладзь з'яўляюцца вернымі патрыётамі сваёй радзімы. І калі ўчора на плошчы паявіўся велізарны макет границ нашай краіны, на варце якіх стаялі доблесныя байцы Чырвонай Арміі, кожны адчуў, якім магутным рэзервам з'яўляецца моладзь для Чырвонай Арміі, з якой смеласцю і сілай вы будзе абараняць сваю мірную працу. «Вораг не перашагне нашых границ», — заявілі совецкія фізкультурнікі, заявіла Уся наша моладзь. У барацьбе з ворагамі наша моладзь паказвае сябе верным і стойкім памочнікам партыі.

Совецкая моладзь мае ўсё для таго, каб расці і ўдасканальвацца ва ўсіх галінах працы, мастацтва, культуры. Краіна прадаставіла ў яе распараджэнне школы і універсітэты, пабудавала лабараторыі і інстытуты, стварыла фізкультурныя клубы і стадыёны, затрачвае сотні мільёнаў і мільярды рублёў на выхаванне і падрыхтоўку новых кадраў. Перад маладымі грамадзянамі нашай радзімы адкрыты ўсе шляхі. У нас знішчана беспрацоўе, і юнаку або дзяўчыне не прыходзіцца трывожыцца за свой заўтрашні дзень. Будучае можа быць толькі яшчэ больш выдатным. Траба толькі ўпарта працаваць і вучыцца, развівацца ў сябе сталінскія якасці, авалодваць большэвізмам і фармаваць з сябе новага чалавека, рознабакова развітага, удалаючага палітычнай пільнасцю, умеючага змагацца за сваю радзіму да апошняй кроплі крыві.

Парад паказаў немалыя дасягненні совецкай фізкультуры. Але мы не былі-б большэвікамі, калі-б супакоіліся на дасягнутым і праходзілі міма недахопаў. У нашай краіне, дзе такое мноства талентаў і магчымасцей, пастаноўка фізкультурнай работы павінна быць узорнай ва ўсіх адносінах. Мы маем усе даныя для таго, каб заваяваць усе сусветныя рэкорды па спорту і зрабіць фізічную культуру здабыткам усяго народу, арганізаваць яе ў шырокім дзяржаўным маштабе. Моладзь павінна быць застрэльшчыкам гэтага дасягнення, страсным і нястомным байцом за фізічнае развіццё прапоўных. Няма сумнення ў тым, што наступны фізкультурны парад пакажа новыя поспехі і дасягненні совецкіх спартсменаў, к гэтаму часу паявяцца новыя мільёны фізкультурнікаў, бездакорна валодаючых усімі відамі спорту і абароны.

Расці і развівайся, совецкая моладзь! Радзіма, даўшы табе ўсё, як пяшчотная і клапатлівая маці, ахоўвае тваю маладосць і шчасце. Будзь-жа верна сваёй радзіме, гераічна абараняй яе!

„Правда".

ЗАМЕЖНЫЯ ВОДГУКІ НА ДРУГІ ПЕРАЛЁТ МАСКВА—ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС—ЗША

САН-ФРАНЦЫСКА (горад на піхаакіянскім узбярэжжы ЗША), 12 ліпеня (БЕЛТА). Другі пералёт Масква — Паўночны полюс — Паўночная Амерыка, правадзімы гераічнымі совецкімі лётчыкамі Громавым, Юмашовым і Даніліным, выклікаў велізарную цікавасць ва ўсіх грамадскіх колах на піхаакіянскім узбярэжжы ЗША. Цікавасць да гэтага палёту праяўляецца не толькі сярод навуковых і авіяцыйных колаў, але і шырокай грамадскасцю. Усе з велізарнай увагай сочаць за ходам палёту.

Не гледзячы на наяўнасць важных навін, датычных унутранай і замежнай палітыкі, газеты змяшчаюць паведамленні аб пералёце на першай старонцы пад буйнейшымі загалоўкамі. Радыёстанцыі ЗША безупынна перадаюць паведамленні аб ходзе пералёту. Мільёны радыёслухачоў з найвялікшай увагай сочаць за гэтымі паведамленнямі.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 13 ліпеня. (БЕЛТА). Французскі друк з выключнай увагаю сочыць за беспасадачным пералётам тт. Громава, Юмашова і Даніліна па маршруту Масква—Паўночны полюс—ЗША. Рад газет указвае, што мэтай пералёту з'яўляецца не столькі перакрыць сусветны рэкорд дальнасці палёту па прамой лініі, колькі дабіцца ўстанаўлення рэгулярных паветраных зносін паміж Совецкім Саюзам і Амерыкай праз Паўночны полюс.

Орган компартыі «Юманітэ» публікуе інтэрв'ю, данае Героем Совецкага Саюза тав. Громавым маскоўскаму карэспандэнту газеты. Тав. Громаў заявіў, што думка аб падобным беспасадачным пералёце заразілася ў яго яшчэ ў 1924 годзе, але тады такі пералёт быў неажыццявім.

«10 чэрвеня гэтага года, — гаворыць далей Громаў,—я папрасіў дазволу на пералёт праз полюс. Пачалося абмеркаванне гэтага пытання. Заслухаўшы аргументы за і супроць гэтага пералёту, таварыш Сталін выказаўся за задаволенне нашай просьбы, але патрэбаваў ад нас, каб мы былі аспрожны, і ў выпадку неабходнасці, спусціліся ў любым пункце Паўночнай Амерыкі».

Газета «Эр нувель» адзначае, што пералёт тав. Громава, Юмашова і Даніліна сведчыць аб невычарпальных рэсурсах, якія мае совецкая авіяцыя.

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ т.т. ДАГІНА І. Я., РАЕВА М. Г., ГОРБАЧ Г. Ф. і інш.

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР **пастанаўляе:**

За ўзорнае і самаадданае выкананне важнейшых заданняў урада ўзнагарадзіць:

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА:

1. **Дагіна** Ізраіля Якаўлевіча,
2. **Раева** Міхаіла Грыгор'евіча,
3. **Горбач** Грыгорыя Фёдаравіча.

ОРДЭНАМ «КРАСНАЯ ЗВЕЗДА»:

1. **Антонава-Грыцук** Луку Іосіфавіча,
2. **Булах** Петра Фёдаравіча,
3. **Лаўрушына** Івана Якаўлевіча,
4. **Дземенцьева** Васілія Фёдаравіча,
5. **Телешова** Грыгорыя Галакціёнавіча,
6. **Вронскага** Нікалая Мартынавіча,
7. **Зарыфава** Нікалая Цімафеевіча,
8. **Сербінава** Міхаіла Грыгор'евіча,
9. **Паўлава** Власія Арсеньевіча,
10. **Федотава** Фёдара Васільевіча.

ОРДЭНАМ «ЗНАК ПОЧЕТА»:

1. **Еленевіч** Еўгенія Петровіча,
2. **Кавалёва** Валенціна Нікалаевіча.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
11 ліпеня 1937 г.

ЯК МЫ РЫХТАВАЛІ ПЕРАЛЕТ

(ГУТАРКА З НАЧАЛЬНІКАМ ШТАБА ПЕРАЛЁТУ В. І. ЧЭКАЛАВЫМ)

Адважны экіпаж «АНТ-25-1», узначальваемы Героем Совецкага Саюза т. Громавым, ляціць з Масквы ў Паўночную Амерыку праз Паўночны полюс каб яшчэ раз праверыць паветраную трасу, пракладаную Чкалавым, Бялюковым і Беляковым. Гэты шлях з'яўляецца найкарацейшым паветраным шляхам паміж СССР і Амерыкай. Яго адкрыла наша вялікая радзіма, і яна-ж сёння ставіць перад сабой канкрэтную задачу — ужо ў гэтым годзе дабіцца рэальных рэзультатаў па ўстанаўленню паветранай сувязі паміж СССР і Паўночнай Амерыкай праз Паўночны полюс.

Падрыхтоўка да палёту «АНТ-25-1» пачалася 11 чэрвеня, на другі-ж дзень пасля дазволу палёту ўрадам. Громаў, Юмашэў і Данілін паступілі ў распараджэнне ўрачоў з 15 чэрвеня. З таго часу яны амаль бязвыезна жылі на Шчолкаўскім аэрадроме. Урачы ўстанавілі для іх строгі прадпалётны і палётны рэжым.

На працягу гэтага часу таварышы Громаў, Юмашэў і Данілін правялі некалькі трэніровачных палётаў. Ноччу на 2 ліпеня яны знаходзіліся ў паветры 10 гадзін, лятаючы на вышыні 5—6 кілометраў. У часе гэтага палёту яны правяралі кіслародную апаратуру і аэранавігацыйныя прылады.

У падрыхтоўцы самалёта да гэтага дальняга пералёту прымалі ўдзел канструктары, інжынеры, бортмеханікі і матарысты, якія падрыхтоўвалі самалёт Чкалава. Усёй гэтай работай на аэрадроме кіраваў інжынер Стоман. Вялікую дапамогу яму ў гэтай справе аказалі канструктар самалёта «АНТ-25-1» тав. Сухой, канструктар матора «АМ-34» тав. Мікулін, бортмеханік тав. Орлоў, інжынеры-матарысты тт. Мінкнер і Радзевіч. Інжынеры тт. Енгібаран, Аршынаў, Калмыцкі, Галдобенка, Бенедзіктаў, Лебедзеў своечасова падрыхтавалі электраавіяцыйнае абсталяванне, радыёапаратуру, гаручыя і змазачныя сродкі, электраагрэгаты, кантрольна-вымяральныя прылады, аэранавігацыйнае абсталяванне.

У абсталяванні самалёта вялікую ролю адыгралі прадпрыемствы пяжкай, абаронай і лёгкай прамысловасці. Матор быў пабудаван і падрыхтован да пералёту калектывам рабочых завода імя Фрунзе.

Цэнтральны інстытут авіяцыйнага маторабудаўніцтва распрацаваў для гэтага матора спецыяльныя гаручыя і змазачныя сродкі. Заводы Усесаюзнага аб'яднання дакладнай індустрыі згатовілі і забяспечылі самалёт дасканалейшымі аэранавігацыйнымі прыладамі.

У часе падрыхтоўкі самалёта «АНТ-25-1» быў улічан вопыт пералёту Чкалава. Самалёт некалькі аблегчан за кошт унутранога пераабсталявання і, галоўным чынам, за кошт замены аднаго метала другім—больш лёгкім—ці дрэвам. Запас вадкага кіслярода на самалёце Громава ў параўнанні з чкалаўскім павялічан у 3 разы. Узята таксама намнога больш антыабледзяняльнай незамярзаючай вадкасці, якая ў часе палёту ахоўвае віят самалёта ад стварэння на ім ледзяной коркі. Новае ўнесена ў арганізацыю радыёсувязі самалёта з зямлёй.

На тэрыторыі Совецкага Саюза слухаць перадачу з самалёта «АНТ-25-1» будуць каля 20 палярных станцый і ўсе судны, якія знаходзяцца ў Белым і Баранцавым морах, а таксама ў Паўночным Ледавітым акіяне. Усе гэтыя станцыі будуць атрымліваемыя імі весткі з самалёта неадкладна перадаваць галоўнай станцыі, якая размешчана пад Масквой і працуе на кароткіх хвалях. Толькі гэта радыёстанцыя мае права трымаць непасрэдную сувязь з самалётам «АНТ-25-1» і перадаваць яму неабходны матэрыял. Напагатове стаіць і станцыя імя Коміцтэрна, якая працуе на доўгіх хвалях. У выпадку якіх-небудзь ускладненняў, па распараджэнню штаба пералёту яна праз 5 мінут можа пачаць працаваць з самалётам. Адначасова з галоўнай станцыяй будзе працаваць радыёстанцыя вострава Дзіксон. Праз 2 мінуты пасля таго, як самалёт Громава атрымае чарговую зводку ад галоўнай станцыі, дзіксонаўскі радыёцэнтр перадасць яму копію гэтай зводкі. Гэта робіцца для таго, каб у выпадку, калі будуць якія-небудзь ускладненні з прыёмам перадачы галоўнай станцыі, самалёт быў-бы ўсё-ж забяспечан неабходнай для яго зводкай аб надвор'і. Па гэтых-жа кошціх экіпаж «АНТ-25-1» зможа правяраць правільнасць прынятых матэрыялаў.

Па такому-ж прынцыпу будзе арганізавана радыёсувязь з самалётам, калі ён будзе знаходзіцца над Паўночнай Амерыкай. Усе радыёстанцыі, размешчаныя на тэрыторыі Канады і Злучаных Штатаў Амерыкі, будуць прымаць ад самалёта паведамленні і неадкладна перадаваць двум галоўным станцыям, якія знаходзяцца ў Анкорэджы (Аляска) і Сіэтлі (ЗША). Толькі гэтыя дзве станцыі маюць права трымаць прамую двухбаковую сувязь з самалётам тав. Громава. Першай пачне працаваць станцыя, размешчаная ў Анкорэджы. Яе будзе дубліраваць радыёстанцыя форта Сміта, размешчаная каля Вялікага Нявольнічага возера ў Паўночнай частцы Канады. Гэта станцыя добра чула самалёт Чкалава. Калі самалёт «АНТ-25-1» будзе ўдаляцца ўглыб амерыканскага мацерыка, з ім пачне падтрымліваць двухбаковую сувязь галоўная радыёстанцыя, якая знаходзіцца ў Сіэтлі.

Велізарную работу правялі нашы метэаролагі па складанню дакладных карт прагнозаў і па забеспячэнню экіпажа ў дарозе ўсімі неабходнымі весткамі аб надвор'і. Яны правялі ўважлівае наглядзанне за надвор'ем у Цэнтральным палярным басейне і прасачылі за ім на працягу даволі доўгага часу ўдоўж усёй трасы. Вялікую дапамогу ў гэтай справе ім аказала дрэйфуючая палярная станцыя ў раёне Паўночнага полюса. Значныя карэктывы ў нашы весткі аб сінаптычных працэсах у Арктыцы ўнеслі Чкалаў, Байдукоў і Белякоў.

Немалаважную работу правялі ўрачы па падрыхтоўцы пуцівога і аварыйнага харчавання. Агульная вага харчавання значна зменшана, але каларыйнасць яго захована. У аварыйны запас увайшла вялікая колькасць тлушчаў і вітамінаў. У выпадку вымушанай пасадкі экіпаж зможа на працягу паўтара месяца захоўваць добры рэжым харчавання.

Палёт таварышоў Громава, Юмашэва і Даніліна безумоўна дасць новы каштоўны матэрыял для вывучэння вялікай паветранай трасы СССР—Паўночная Амерыка.



Экіпаж самалёта «АНТ-25» на Шчолкаўскім аэрадроме пад Масквой. Злева направа: камандзір самалёта — Герой Совецкага Саюза М. М. Громаў, штурман—ваенінжынер 3-га ранга С. А. Данілін і другі пілот маёр А. Б. Юмашоў. (СФ).

12 ліпеня са Шчолкаўскага аэрадрома пад Масквой стартаваў самалёт «АНТ-25» у беспасадачны пералёт Масква—Паўночны Полюс—Амерыка. Экіпаж самалёта: Герой Совецкага Саюза М. М. Громаў — камандзір, маёр А. Б. Юмашоў — другі пілот, ваенінжынер 3-га ранга С. А. Данілін — штурман. НА ЗДЫМКУ: Герой Совецкага Саюза тав. М. М. Громаў. (СФ).

РАДЫЁГРАМЫ З БОРТА САМАЛЁТА „АНТ-25"

12 ліпеня, 3 гадзіны 43—44 мінуты. Знаходжуся Загорск. Слухайце мяне на хвалі 54,92 метра. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

4 гадзіны 15 мінут. Знаходжуся шырата 57 градусаў 10 мінут, даўгата 38 градусаў 40 мінут. Вышыня палёту 500 метраў. Наперадзе відаць кучавая воблачнасць.

ДАНІЛІН.

5 гадзін 10 мінут. Знаходжуся шырата 58 градусаў 25 мінут, даўгата 39 градусаў 50 мінут. Усё ў парадку. Ад Загорска ідзем над суцэльнай слаістай воблачнасцю. Вышыня палёту 900 метраў, над намі 9 балаў слаіста-кучавой. Паўтарыце радыёграму № 3. Да прыёму гатоў.

ДАНІЛІН.

6 гадзін 31 мінута. Знаходжуся шырата 60 градусаў, даўгата 41 градус. Вышыня палёту 1.700 метраў. Я лячу над воблакамі. Часамі сляпы палёт. Радыёграмы № 3 і № 4 прыняў поўнасцю. Вас чую на хвалі 53,24 метра. Усе ў парадку.

ДАНІЛІН.

7 гадзін 9 мінут. № 4 прыняў. Знаходжуся шырата 61 градус 20 мінут, даўгата 41 градус 30 мінут. Лячу над воблакамі.

ДАНІЛІН.

7 гадзін 48—52 мінуты. Усё ў парадку. Ад Загорска не бачылі зямлі. Суцэльная воблачнасць пад намі, з разрывамі — над намі. Паведаміце ці адкрыт бераг мора і які вецер на вышыні 1.500 метраў.

ДАНІЛІН.

8 гадзін 10—12 мінут. Усё ў парадку. Паўтарыце апошнюю радыёграму.

ДАНІЛІН.

9 гадзін 15—16 мінут. № 8 прыняў. Паўтарыце хвалю Мурманска. Да прыёму гатоў.

ДАНІЛІН.

9 гадзін 50 мінут. Архангельск чую добра. Мурманска не чую. Чаму? 9 гадзін 10 мінут былі на шыраце Архангельска. Лячу над воблакамі.

ДАНІЛІН.

10 гадзін 14 мінут. Вашу радыёграму № 10 прыняў поўнасцю. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

11 гадзін 38—39 мінут. Знаходжуся шырата 67 градусаў 30 мінут, даўгата 47 градусаў 20 мінут.

ДАНІЛІН.

12 гадзін 21—25 мінут. № 12 прыняў. Знаходжуся шырата 67 градусаў 45 мінут, даўгата 47 градусаў 40 мінут. Слухайце мяне на хвалі 26,35 метра.

ДАНІЛІН.

13 гадзін 21—25 мінут. Знаходжуся Калгуеў. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

14 гадзін 17 мінут. Знаходжуся шырата 70 градусаў, даўгата 51 градус. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

15 гадзін 25 мінут. Вас прыняў. Чую добра, але збіваецца настройка. Вас чую на хвалі 32,6. Новая Зямля. 15 гадзін 15 мінут. Высата 600. Усё ў парадку.

ЮМАШОЎ.

16 гадзін 9—12 мінут. Усё ў парадку.

ЮМАШОЎ.

17 гадзін 26—30 мінут. Вас чую на хвалі 18,36. Знаходжуся на шыраце 74° 10', даўгаце 56°. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

18 гадзін 20-23 мінуты. Вас чую на хвалі 18-36 дрэнна. Дзіксон не чую зусім. Знаходжуся шырата 76°, даўгата 58°. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

19 гадзін 11—12 мінут. Знаходжуся шырата 77° 20', даўгата 58°.

ДАНІЛІН.

20 гадзін 16—17 мінут. Маяк Рудольфа не чую. Чую маяк М. Жэланія. Знаходжуся шырата 78° 50', даўгата 58°. Дзіксон не чую.

Р. Т. *)

21 гадзіна 25 мінут. Знаходжуся шырата 81° 30', даўгата 58°. Вас чую на хвалі 18,36.

ДАНІЛІН.

НАД ВОСТРАВАМ РУДОЛЬФА.

МАСКВА, «Правда»

ВОСТРАЎ РУДОЛЬФА, 12 ліпеня. (Радыёспец. кар. «Праўды»). Сёння ў 22 гадзіны 01 мінута самалёт «АНТ-25» прайшоў над востравам Рудольфа на ўсход ад аэрадрома, прыкладна на высаце 2.000 метраў.

ЛІБІН.

23 гадзіны 08—10 мінут. Праходзім цыклон. Палёт сляпы. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

*) «Р. Т.» — пазыўныя самалёта «АНТ-25».

РАДЫЁГРАМЫ З БОРТА САМАЛЁТА „АНТ-25"

13 ЛІПЕНЯ, 0 гадзін 15 мінут. Праходзім цыклон. Знаходжуся шырата 86°, даўгата 58°. Высата палёта 4.500 метраў.

ДАНІЛІН.

1 гадзіна 05 мінут. Чую добра на хвалі 18,36 метра. Слухайце мяне на хвалі 26,35 метра. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

2 гадзіны 07 мінут. Прывітанне завалвальнікам Арктыкі Папаніну, Кренкелю, Шыршову, Фёдараву.

Экіпаж самалёта «АНТ-25» — ГРОМАЎ, ДАНІЛІН, ЮМАШОЎ.

3 гадзіны 14 мінут. Падышлі да полюса. Высата палёта 2.700 метраў. Шляхавая скорасць 160 кілометраў у гадзіну. Тэмпературa паветра мінус 8 градусаў. Самаадчуванне экіпажа добрае. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

4 гадзіны 50 мінут. Знаходзімся шырата 88 градусаў, даўгата 120. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

10 гадзін 47 мінут. Знаходжуся над пралівам Мельвіль. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН.

11 гадзін 10 мінут. Знаходжуся на шыраце 74 град., даўгата 120 град. Слухайце на хвалі 54,92 метра, перадаванне на хвалі 34,8 метра.

ДАНІЛІН.

12 гадзін 12 мінут. Слухайце мяне на хвалі 54,92 метра. Перадаванне на хвалі 34,9 метра.

ДАНІЛІН.

Нашымі паўночнымі пунктамі прынята:

«У 15 гадзін 21 мінуту знаходжуся на шыраце 66 градусаў, даўгата 122 градусы. Усё ў парадку.

ДАНІЛІН».

«АНТ-25» ІДЗЕ ДАКЛАДНА ПА ГРАФІКУ

Самалёт «АНТ-25» ідзе дакладна па распрацаванаму графіку. Над полюсам ён павінен быў прайсці ў 3 гадзіны 27 мінут. Самалёт дасягнуў полюса ў 3 гадзіны 14 мінут. У сувязі з паспяховым ходам пералёту, штаб пералёту паслаў экіпажу самалёта «АНТ-25» наступнае віншаванне:

«Рады бліскучаму ходу пералёту. Віншуем з рэкордным часам дасягнення полюса. Жадаем поўнага поспеху.

ШТАБ».

ЗАХОПЛЕНЫ ХРАБРАСЦЮ СОВЕЦКІХ ЛЕТЧЫКАЎ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 13 ліпеня (БЕЛТА). За беспасадачным палётам гераічных совецкіх лётчыкаў на самалёце «АНТ-25» з Масквы ў Паўночную Амерыку праз Паўночны полюс сочаць з неаслабнай увагаю ва ўсёй Англіі. Англійскае радыёвяшчанне на працягу ўсёй учарашняй ночы перадавала паведамленні аб ходзе палёту «АНТ-25», як аб адной з найбольш выдатных падзей дня. Паведамленні агенцтваў з Масквы, Нью-Ёрка, Сіэтла і іншых пунктаў выдаваліся праз кароткія прамежкі часу; у іх уключаліся паведамленні, перадаваемыя совецкімі палярнымі радыёстанцыямі. Усе сённяшнія газеты публікуюць падрабязныя паведамленні аб палёце, а многія з іх змясцілі дыяграму, якая паказвае маршрут пералёту праз Паўночны полюс, па якому ідзе совецкі самалёт.

Газеты падкрэсліваюць здольнасці і заслугі Громава, Юмашова і Даніліна і пералічваюць папярэднія дасягненні Громава. Адзначаецца больш хуткае прасоўванне самалёта па маршруту ў параўнанні з самалётам Чкалава і падкрэсліваецца, што Громаў мае магчымасць скарыстаць вопыт, атрыманы ў першым палёце. Палярныя палёты совецкіх лётчыкаў, без усякага сумнення, прыцягнулі ўсеагульную ўвагу ў Англіі. Захапленне здольнасцю і храбрасцю совецкіх лётчыкаў, а таксама высокая ацэнка прэстыжа СССР, з'яўляецца агульнай тэмай размоў у Англіі.

М. М. ГРОМАЎ

Герой Совецкага Саюза.

СТАЛІНСКАЯ ТРАСА

I.

Мысль аб палёце ў Паўночную Амерыку праз полюс зарадзілася ў мяне даўно. Гэта задача прыцягнула да сябе ўвагу раду совецкіх лётчыкаў. У друку ідэя транспалярнай авіяцыйнай сувязі паміж СССР і ЗША была выказана ўпершыню тры гады назад Героем Совецкага Саюза С. А. Леваневускім. З тае пары совецкія лётчыкі сталі займацца гэтай праблемай.

У той дзень, калі таварышы Чкалаў, Байдукоў і Леваневускі былі прыняты кіраўнікамі партыі і ўрада, я, на мой вялікі жаль, быў хворы і не мог прысутнічаць на гэтай выдатнай гутарцы, на якую быў таксама выклікан. Пасля выздараўлення я прасіў прыняць мяне і дазволіць мне палёт праз полюс у Паўночную Амерыку.

Просьба была задаволена. 10 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, я быў прынят таварышам Сталіным, Молатавым, Варашылавым, Межлаукам. На прыёме прысутнічалі таксама таварышы Алксніс і Рухімовіч.

Мяне запыталі:

— Што вы можаце прапанаваць?

Я адказаў, што хачу ляцець праз полюс у ЗША. У зробленым абмене думкамі таварышы Сталін і Варашылаў падтрымалі маю просьбу. Пасля абмеркавання асобных дэталей палёту было вынесена рашэнне: дазволіць пералёт.

II.

Палёт на далёкую адлегласць без пасадкі — адно з заветных летуценняў чалавецтва. З трох важнейшых праблем авіяцыі — дальнасць, вышыня, скорасць — дальнасць лічыцца самым трудным дасягненнем.

Для такога палёту патрабуецца надзейнай канструкцыі самалёт, бездакорны матор, здольны бесперапынна працаваць доўгі час, і выносліва. умелы экіпаж. Усё гэта ёсць у нашай краіне. Нашы канструктары і прамысловасць ствараюць выдатныя самалёты і маторы. У авіяцыйных школах, у часцях Чырвонай Арміі, на заводах выкоўваюцца выдатныя кадры лётчыкаў. Мы маем усе ўмовы для ўпартага і планамернага заваявання адлегласцей падобна таму, як намі заваёўваецца і асвойваецца Арктыка, самыя недаступныя яе раёны.

Сувязь двух вялікіх краін — СССР з ЗША — па найкарацейшаму шляху — праз полюс з'яўляецца ярчэйшым выражэннем адной з асноўных уласцівасцей авіяцыі: быць незалежнай ад земных шляхоў. Хапя пра самалёты і гаворыць, што яны, як птушкі, лятаюць прама, не лічачыся з горамі, лясамі і морамі, але практычна, як вядома, справа абстаіць яшчэ далёка не так.

На земным шары нямала абшырных «белых плям», дзе не лятаў самалёт. Яшчэ нядаўна лічылі немагчымым (асабліва ў замежных колах) палёты ў Арктыцы. Аднак гісторыя развіцця совецкай палярнай авіяцыі паказала, што для нашых машын і людзей суровая Поўнач перастае быць неадольным бар'ерам. Чэлюскінская эпапея, шматлікія палёты палярных лётчыкаў з мэтай разведкі ільдоў і звера, нарэшце, нядаўняя бліскучая паветраная аперацыя з пасадкай важкіх караблёў па самым полюсе гаворыць не толькі аб заваяванні, але і аб дзелавым асваенні найтруднейшых у лётных адносінах абласцей земнага шара.

Палёт эскадры важкіх караблёў да самага полюса, бліскучая пасадка іх на дрэйфуючай крызе і зварот на маперык без адзінай паломкі і аварыі змяняюць і расшыраюць усе ўяўленні аб сучаснай авіяцыі. Гэта — буйнейшы крок наперад.

Пасля гэтай бяспрыкладнай паветранай аперацыі ўсе нашы лётчыкі пачынаюць ужо мысліць іншымі маштабамі. Совецкія лётчыкі шукаюць новыя мэты, якія варта было-б ціпер заваяваць на карысць сваёй радзімы. Нашы самалёты служаць справе праграсу ўсяго чалавецтва.

Натуральна, што погляды многіх спыняюцца ў першую чаргу на лініі, што злучае Еўропу і Азію з Амерыкай. Найкарацейшая лінія, калі яе правесці на глобусе, вядзе праз полюс.

Пералёт ад Масквы, скажам, да Санфранцыска праз полюс з'яўляецца надзвычай трудным па метэаралагічных умовах. На такой трасе амаль немагчыма разлічваць на ідэальнае надвор'е на ўсёй адлегласці. Можна чакаць найбольш спрыяючых умоў на тых ці іншых участках, але траса перасякае паясы зусім розных кліматаў, і ўстанаўленне ўсюды роўнага, добрага надвор'я на двое сутак трэба лічыць практычна выключаным. Асабліва трудны для палётаў Цэнтральны палярны басейн, дзе надвор'е вельмі няўстойлівае і зменлівае.

Другая труднасць — немагчымасць арыентавацца па магнітнаму компасу ў самым нявывучаным раёне — за Паўночным полюсам. Тут траса праходзіць блізка ад магнітнага полюса зямлі, які блытае ўсе звычайныя паказанні компаса. Сонечны ўказальнік курсу (СУК) можа працаваць толькі ў тым выпадку, калі сонца не закрыта воблакамі. У той-жа час гэта самы небяспечны раён для вымушанай пасадкі, бо сюды не заходзяць ніякія караблі свету.

III.

Устанавіўшы рэкорд, совецкія лётчыкі імкнуцца зрабіць яго здабыткам многіх.

Неўзабаве пасля пералёту Чкалава, Байдукова і Белякова ідзем праз полюс у Амерыку мы. Наш палёт мае асобае значэнне іменна таму, што ён другі. Мы хочам паказаць, што гераічны пералёт Чкалава, Байдукова і Белякова можа быць ва ўсякі момант паўторан другой групай совецкіх лётчыкаў, за якой паследуе, калі патрэбна, трэцяя, і т. д. Падобна таму, як палёт чатырох важкіх караблёў к полюсу даказаў, што такі рэйс можа быць зроблен не асобным, а многімі самалётамі і лётчыкамі Совецкай краіны, падобна гэтаму мы пастараемся даказаць, што шлях з Масквы ў Амерыку праз полюс адкрыт не раз у гісторыі. Не сумняваемся, што за намі пойдуць і іншыя. Мы нават мяркуем, што наступны рэйс праз полюс у Амерыку, якога не давядзецца доўга чакаць, будзе зроблен ужо з пасажырамі і грузам. Гэта будзе пачаткам асваення першай у гісторыі чалавецтва транспалярнай лініі, якая здавалася фантастычнай нават спецыялістам авіяцыі ўсяго некалькі год назад.

Выбар машыны для такога адказнага палёту не быў доўгім. У совецкім авіяцыйным парку ёсць у поўнай меры падыходзячая для гэтай мэты машына — «АНТ-25». На гэтай машыне быў зроблен у 1934 г. палёт па замкнутай крывой на 12.411 кілометраў (Громаў, Філін і Спірын), пералёт у 1936 г. па Сталінскаму маршруту аллегласцю ў 9.374 кілометры (Чкалаў, Байдукоў і Белякоў) і, нарэшце, пералёт з Масквы ў Портланд.

Самалёт, на якім мы ляцім, сканструіраван у Цэнтральным аэрагідрадынамічным інстытуце (ЦАГІ) па праекту А. Н. Тупалева некалькі год назад. «АНТ-25» уяўляе сабой адназаматорны манаплан з размахам крылляў у 34 метры. Дзякуючы добрай грузападёмнасці і той акалічнасці, што адзін матор расходуе адносна мала гаручага (у параўнанні з многаматорнымі самалётамі), машына (апошні палепшаны ўзор) можа лятаць без пасадкі каля 14 тысяч кілометраў.

На «АНТ-25» устаноўлен матор «АМ-34» вядомага совецкага канструктара А. Мікуліна. Далёкі пералёт патрабуе, каб матор безадмоўна працаваў не менш 80—100 гадзін падрад. Пералёты Чкалава, Байдукова і Белякова на «АНТ-25» паказалі, што «АМ-34» адказвае самым прыдзірчывым патрабаванням.

Адрозненняў у абсталяванні нашай машыны ад чкалаўскай амаль няма ніякіх. Пры выбары спаражэння мы імкнуліся яшчэ больш аблегчыць вагу грузу. Мы зноў пераглядзелі ўсе прадметы спаражэння, стараючыся пазбавіцца ўсіх «лішніх» грамаў. Так, мы бярэм аптэчку вагой не ў 10 кілограмаў, а ўсяго ў 1,5 кілограма. Некалькі скарачаем недакранальны запас харчоў, у сэнсе вагі, але не каларыйнасці. Над гэтым давялося папрацаваць урачам. Улічваем таксама такія рэчы, як чахлы для ружжаў. Мы раньлі ўзяць ружжы без чахлоў. Аблягчаем мы спаражэнне для таго, каб узяць больш гаручага.

Мы ляцім на першым, вынушчаным у нашай краіне самалёце «АНТ-25». Чкалаў, Байдукоў і Белякоў ляцелі на другім, палепшаным узоры, але тыя ўдасканаленні, якія ўведзены на другой машыне, дабаўлены і да нашай.

На нашым самалёце пакінута падвойнае кіраванне (на машыне Чкалава, Байдукова і Белякова яно знята). Ёсць падвойным кіраванні зручней рабіць змену вахт. Самалёт ні адной секунды не будзе аставацца без кіравання.

Арганізацыя радыёсувязі ў нас будзе некалькі іншая, чым у першым пералёце. Мы думаем трымаць сувязь з адной, максімальна з двума станцыямі ў нас ў СССР, а таксама і ў Амерыцы, калі пераляцім за полюс. Гэта вызваліць экіпаж ад настройкі на розныя станцыі, аблегчыць яго работу, заканоміць сілы.

IV.

У склад экіпажа, апрача мяне, уваходзяць другі пілот — маёр А. Б. Юмашэў і штурман С. А. Данілін. Лётчык Юмашэў добра вядомы ўсёй краіне сваімі рэкордны-мі высотнымі палётамі на чатырохматорных самалётах з вялікімі грузамі. Ён зрабіў таксама некалькі палётаў на дальнасць. С. А. Данілін — адзін з лепшых штурманаў Совецкага Саюза. Яго кніга па навігацыі з'яўляецца прызнаным падручнікам у авіяцыйных школах. Ён прымаў удзел у радзе палётаў, якія патрабавалі выключнага штурманскага майстэрства: на «АНТ-9» — у Турцыю, на «АНТ-6» — у Парыж, са мной на «АНТ-35» па маршруту Масква—Ленінград (скорасны пералёт) і ў іншых. У гэтых палётах ён праявіў бліскучыя штурманскія здольнасці.

Што ўяўляе сабой наш шлях? Чытачы ўжо знаёмы з ім па пералёту Чкалава, Байдукова і Белякова. Трэба напомніць, што гэты маршрут яшчэ вельмі мала вывучан, і тысячы рознастайных нечакананасцей могуць тут сустрэцца. Адна з задач нашага палёту — больш глыбокае вывучэнне гэтай трасы з тым, каб пакарыць яе, разгадаць усе таямніцы «белай плямы» і знайсці надзейныя спосабы адолення ўсіх перашкод.

Мы пастараемся пераляцець над Новай Зямлёй або востравам Рудольфа. Але калі надвор'е будзе дрэннае, мы паляцім па прамой да Паўночнага полюса, а за полюсам возьмем курс на поўдзень па 120 ці 115 мерыдыяну.

На нашым шляху над тэрыторыяй Совецкага Саюза няма буйных населеных пунктаў. Гарады будуць аставацца ў баку. Выляцеўшы са Шчолкаўскага аэрадрома і ўзяўшы курс на поўнач, мы ля-

(Працяг на 4-й стар.).

Свята шчаслівай маладосці

Высока ў паўхвёснымі небе ярка гарыць пяціканечная звёзды кремлёўскіх вежаў. Уздоўж доўгай сцяны былых гандлёвых радоў, насупроць Ленінскага мавзолея, — кумачовы транспарант: «Гарачае прывітанне лепшаму другу фізкультурнікаў таварышу Сталіну!» А над транспарантам — велізарныя партреты Леніна і Сталіна, акайлёныя кветкамі і зеленню.

На залітай сонцам Краснай плошчы выстрайваюцца прыбываючыя з усіх канцоў Масквы калоны совецкіх фізкультурнікаў. Лётчыкі і парашутысты, стралкі і альпіністы, футбалісты і валейбалісты, гіравікі і штангісты, тэнісісты і бегуны, барцы і баксёры, веласіпедысты і матацыклісты, плаўцы і лыжнікі — прадстаўнікі ўсіх відаў спорта, радасныя, загарэлыя, мужныя, натрэніраваныя, прышлі сюды, у цэнтр сталіцы, каб паказаць магутнасць і сілу совецкага спорту, яго поспехі і дасягненні.

Сёння Красная плошча выглядае асаблівa жывапісная: у прыгожую расфарбоўку спартыўных убраняў сёння ўплятаюцца яркія фарбы нацыянальных касцюмаў усіх адзінаццаці рэспублік Совецкага Саюза.

Шчаслівыя і гордыя за свой народ, за яго вялікія поспехі ў социялістычным будаўніцтве, яны разам з рускімі таварышамі, плячом к плячу з фізкультурнікамі пролетарскай сталіцы сёння дэманструюць сваю адданасць вялікаму сцягу комуністычнай партыі, сваю гарачую любоў да таварыша Сталіна, сваю гатоўнасць абараняць Совецкі Саюз ад любога ворага, адкуль-бы ён ні прабаваў напасці на нашу социялістычную радзіму.

Роўна а першай гадзіне дня ад Гістарычнага музея рохам пракатваецца каманда: «Парад, смірна!» На левае крыло мавзолея падымаюцца таварышы Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Андрэеў, Мікаян, Чубар, Жданаў, Ежоў, Дзімітраў, Хрушчоў.

Узрыў апладысментаў, дзесяткі тысяч фізкультурнікаў захапляюча апладыруюць. Па плошчы перакатваюцца крыкі «ура» ў гонар таварыша Сталіна, кіраўнікоў партыі і совецкай краіны.

З варот Спаскай вежы на аўтамабілі выязджаюць тт. Косарэў, Маскатаў, Харчэнка і Ерастаў. Перад мавзалеем нашына спыняецца. Камандуючы парадам палкоўнік Талпежнікаў аддае рапарт. Аб'ехаўшы плошчу, кіраўнікі совецкіх фізкультурнікаў падымаюцца на трыбуну.

Пачынаецца кароткі мітынг.

Прамова тав. І. І. Харчэнка

(Старшыня Усесаюзнага камітэта па справах фізкультуры і спорта пры СНК СССР)

Ад імя Усесаюзнага камітэта па справах фізкультуры і спорта пры Соўнаркоме СССР вітаю ўсіх удзельнікаў нашага парада і ў вашай асобе — усіх фізкультурнікаў нашай совецкай краіны.

Наш парад адбываецца ў момант, калі краіна Совецтаў мае Сталінскую Канстытуцыю, якая забяспечвае вялікія правы і блага для чалавека. Калі гаворыць: «Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя», гэта гучыць: «Няхай жыве чалавек і яго шчаслівае сучаснае і будучае».

Яркім выразам дружбы народаў СССР усіх нацыянальнасцей з'яўляецца ўдзел у парадзе ўсіх рэспублік Совецкага Саюза. Гэта сведчыць аб трыумфе ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, гэта сведчыць аб велізарнай увазе, якою акружае нашу совецкую моладзь, совецкіх фізкультурнікаў правадыр народаў таварыш Сталін. Яго бацькоўскія клопаты і любоў праяўляюцца штодзенна і выражаны на сённешнім парадзе.

Няма слоў для выражэння выключна вялікай радасці совецкіх фізкультурнікаў, на долю якіх выпала вялікае шчасце перад тварам правадыра народаў, перад тварам кіраўнікоў партыі і ўрада напярэдадні XX-годдзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі дэманстраваць сваю беззаветную адданасць, сваю вернасць радзіме, ураду і нашай партыі, сваю любоў і адданасць правадыру народаў — любімаму таварышу Сталіну.

Сёння фізкультурнікі Совецкага Саюза перад магілай вялікага генія чалавецтва Уладзіміра Ільіча Леніна, перад тварам комуністычнай партыі і яе кіраўнікоў, перад тварам вялікіх пролетарскай сталіцы сёння дэманструюць сваю адданасць вялікаму сцягу комуністычнай партыі, сваю гарачую любоў да таварыша Сталіна, сваю гатоўнасць абараняць Совецкі Саюз ад любога ворага, адкуль-бы ён ні прабаваў напасці на нашу социялістычную радзіму.

За сяганосцамі ідзе атрад заслужаных майстроў спорту, якіх ведае ўся краіна. Сярод іх — чэмпіён СССР па боксу Міхайлаў, вядомыя бегуны браты Знаменскія, майстры футбольнага поля браты Старасціны, адзін з лепшых фізкультурнікаў Чырвонай Арміі Аніканаў і інш.

Так адкрываецца паток фізкультурнікаў. Ён льецца праз плошчу звыш двух гадзін. Адна калона зміяне другую, сапернічае паміж сабой яркасцю, красатой, астраум'ем мастацкага афармлення. Дзівосны жывыя групы, дзівосны піраміды і гірлянды, складзеныя з юнакоў і дзяўчат, дзівосны астраумныя маделі... Але ўсяго дзівосней сама моладзь, — моцная і стройная, бадзёрая, вясёлая, адухатвораная, з'яднаючая выдатную вайсковую выпраўку з дасканалай свабодай рухаў. Якія цудоўныя твары, і якія прыгожыя, нібы сышоўшыя з антычных барэльефаў фігуры!

У цэнтры шэствія калон — делегацыі дзесяці Саюзных Рэспублік. Разам з маскоўскімі і ленінградскімі фізкультурнікамі яны прадстаўляюць увесь наш Саюз. У гэтым асаблівая рыса фізкультурнага параду гэтага года. Масква апраўдвае сваё высокае званне чырвонай сталіцы Саюза — краіны, у якой квітнее дружба шматлікіх народаў.

Шэствіе шматнацыянальнае і таму шматфарбовае. Пад ласкавым сонцам гарыць шоўкавыя тканіны — чырвоныя, зялёныя, жоўтыя... Украінская, беларуская, азербайджанская, грузінская, армянская, туркменская, узбекская, таджыкская, казахская, киргізская моладзь ідзе часткай у нацыянальных сваіх касцюмах. Але і тыя, хто носіць спартыўныя майкі, упрыгожваюць іх лентамі яркіх колераў. І шэствіе разгортваецца як квітнеючае поле, як жывы дыван, на якім выткаены смяючыяся і радасныя твары юнакоў і дзяўчат.

За калонай нацыянальных делегацый весела рухаюцца, іграючы на-ходу, юныя піонеры Масквы. Праходячы міма трыбуны, на якой стаіць кіраўнікі партыі і ўрада, яны дружна крычаць звонкімі дзіцячымі галасамі: «Дзякуй таварышу Сталіну за наша шчаслівае дзяцінства!» Твары, узнятыя ад радасці, пацвярджаюць гэта. Дзеці перакідваюцца мячамі, гуляюць у лаўн-тэніс... Смех звініць над калонай, і смяюцца глядачы на трыбунах.

Бездакорна падцягнутыя, з франтоўствам асаблівай выпраўкі праходзяць студэнты фізкультурных інстытутаў і тэхнікума. І за імі бясконцай вераніцай ідуць калоны рабочых добраахвотных спартыўных таварыстваў. Наперадзе — адборны атрад гімнастаў маскоўскіх профсаюзаў. За імі таварыства «Локомотив», аб'ядноўчае фізкультурнікаў-чыгуначнікаў і рабочых заводаў чыгуначнага транспарта. Удзельнікаў многа, яны на-ходу практыкуюцца ў розных відах спорту і атрымліваюць заслужанае адабрэнне трыбун.

Вялікай калонай прадстаўлена таварыства «Буревестник» — гэта моладзь дзяржгандлю. Работнікі нашых магазінаў вельмі добра робяць практыкаванні на трапецыях.

Над плошчай праносяць вялікую мадэль совецкага павільёна на міжнароднай Парыжскай выстаўцы. Вядомая скульптура, вянчаючая гэты павільён: юнак і дзяўчына ў імкнёным руху наперад. На парадзе гэта скульптура ажыла. Жывая пара, стройны юнак і прыгожая дзяўчына, імкнуцца нібыта ўвысь...

Музыка змаўкае... Здалёк даносіцца рытмічны гук магутнага кроку. З песнямі ўступае на плошчу калона фізкультурнікаў Чырвонай Арміі. Іх сустракаюць бурнымі прывітаннямі. Відовішча гэта выключнае, незабыўнае.

Аголеныя целы, шакаладныя ад роўнага і здаровага загару, сільныя, мускульныя, дышуць свежасцю і здаровай маладосцю. Аголены гладка выбрытыя галовы... Усе як адзін! І ва ўсіх тварах спакойная і вясёлая ўпэўненасць, ва ўсіх вачах жывая іскарка. Яны ідуць быстра, лёгка і свабодна, з песнямі аб радзіме і аб Сталіне, і ў іх руху адчуваецца жалезная, несакрушальная сіла.

Услед за калонамі рабочай моладзі бавуўнянапапяровай прамысловасці, трыкатажнай, грамадзкага харчавання, сярэдняга машынабудаўніцтва, электрастанцый і інш. ідзе калона «Ударніка». Гэта — маладыя педагогі, работнікі сярэдняй і пачатковай школы. Як далёк новы настаўнік, совецкі настаўнік, ад прывычнага старога тыпу дарэволюцыйнага педагога. Чэхаўскі «чалавек у футляры», настаўнік гімназіі, прышпіў адночны ў жах, убачыўшы моладога настаўніка на веласіпедзе. Гэта было непрыстойна! Совецкія маладыя настаўніцы і настаўнікі ідуць сярод рабочай моладзі. Яны павінны быць прыкладам для сваіх вучняў і ў спорце, і ў фізкультуры.

Калона «Комунара» — рабочых шасейна-дарожнага будаўніцтва — астраумна аформіла, сябе як велізарны трактар на гусеніцах.

Шэствіе перарываецца на кароткі час, музыка змаўкае, і плошча напаўняецца серабрыстым звонам тысячы званочкаў. Гэта праходзяць веласіпедысты Масквы.

У калоне «Спартака», праходзячай з выступленнямі па розных відах спорту, звяртае асаблівую ўвагу на сябе каманда футбалістаў, вышэйшая пераможцамі ў спаборніцтве з камандай Краіны Баскаў. Тт. Сталін, Молатаў, члены ЦК і ўрада, публіка ім бурна апладыруе.

Шэствіе калон прадаўжаецца ўжо каля двух гадзін. У тры гадзіны пад гукі фанфар уступае на плошчу «Дынамо». Над галоўным атрадам велічна плыве вялікі сцяг з папулярнейшай у Саюзе літарай — галубым «Д» на белым полі.

Як заўсёды, калона «Дынамо» афармлена з вялікім мастацкім густам. Яе праходжанне праз плошчу — гэта разам і цікавае выступленне выдатных гімнастаў. Па-халу складаюцца піраміды, робіцца практыкаванне ружжамі, лыжнікі бягуць на лыжах, да якіх прыстасаваны ролікі, юныя члены Болшэвскай комуны робяць галавакружальныя прыжкі.

Эфектна афармлена калона будаўнікоў канала Масква-Волга. Праз мастацка зробленую мадэль шлюза праходзяць элегантныя яхты.

Калону «Дынамо» і ўсё шэствіе заключае добра аформіленая група пагранічнікаў. На платформе, дэкарыраванай зеленню, стаяць, ляжаць маладыя байцы нашай пагранаховы. Яны ўважліва ўглядаюцца ў даль. «Вораг не перашагне нашых граніц!» Гэты надпіс і гэта група сведчаць аб тым, што вясёлы і святочны характар фізкультурнага парада нічога агульнага не мае з бясклопатнасцю.

Несакрушальная сіла

... Гучыць барабанны дроб, у яго ўразаюцца фанфары — гэтым абвяшчаецца пачатак шэствія калон. Ля Гістарычнага музея нібы расквітае гіганцкая чырвоная кветка, над белымі спартыўнымі касцюмамі лепшых стаханаўцаў-фізкультурнікаў Масквы развяваюцца дзесяткі чырвоных сцягаў.

За сяганосцамі ідзе атрад заслужаных майстроў спорту, якіх ведае ўся краіна. Сярод іх — чэмпіён СССР па боксу Міхайлаў, вядомыя бегуны браты Знаменскія, майстры футбольнага поля браты Старасціны, адзін з лепшых фізкультурнікаў Чырвонай Арміі Аніканаў і інш.

Так адкрываецца паток фізкультурнікаў. Ён льецца праз плошчу звыш двух гадзін. Адна калона зміяне другую, сапернічае паміж сабой яркасцю, красатой, астраум'ем мастацкага афармлення. Дзівосны жывыя групы, дзівосны піраміды і гірлянды, складзеныя з юнакоў і дзяўчат, дзівосны астраумныя маделі... Але ўсяго дзівосней сама моладзь, — моцная і стройная, бадзёрая, вясёлая, адухатвораная, з'яднаючая выдатную вайсковую выпраўку з дасканалай свабодай рухаў. Якія цудоўныя твары, і якія прыгожыя, нібы сышоўшыя з антычных барэльефаў фігуры!

У цэнтры шэствія калон — делегацыі дзесяці Саюзных Рэспублік. Разам з маскоўскімі і ленінградскімі фізкультурнікамі яны прадстаўляюць увесь наш Саюз. У гэтым асаблівая рыса фізкультурнага параду гэтага года. Масква апраўдвае сваё высокае званне чырвонай сталіцы Саюза — краіны, у якой квітнее дружба шматлікіх народаў.

Шэствіе шматнацыянальнае і таму шматфарбовае. Пад ласкавым сонцам гарыць шоўкавыя тканіны — чырвоныя, зялёныя, жоўтыя... Украінская, беларуская, азербайджанская, грузінская, армянская, туркменская, узбекская, таджыкская, казахская, киргізская моладзь ідзе часткай у нацыянальных сваіх касцюмах. Але і тыя, хто носіць спартыўныя майкі, упрыгожваюць іх лентамі яркіх колераў. І шэствіе разгортваецца як квітнеючае поле, як жывы дыван, на якім выткаены смяючыяся і радасныя твары юнакоў і дзяўчат.

За калонай нацыянальных делегацый весела рухаюцца, іграючы на-ходу, юныя піонеры Масквы. Праходячы міма трыбуны, на якой стаіць кіраўнікі партыі і ўрада, яны дружна крычаць звонкімі дзіцячымі галасамі: «Дзякуй таварышу Сталіну за наша шчаслівае дзяцінства!» Твары, узнятыя ад радасці, пацвярджаюць гэта. Дзеці перакідваюцца мячамі, гуляюць у лаўн-тэніс... Смех звініць над калонай, і смяюцца глядачы на трыбунах.

Бездакорна падцягнутыя, з франтоўствам асаблівай выпраўкі праходзяць студэнты фізкультурных інстытутаў і тэхнікума. І за імі бясконцай вераніцай ідуць калоны рабочых добраахвотных спартыўных таварыстваў. Наперадзе — адборны атрад гімнастаў маскоўскіх профсаюзаў. За імі таварыства «Локомотив», аб'ядноўчае фізкультурнікаў-чыгуначнікаў і рабочых заводаў чыгуначнага транспарта. Удзельнікаў многа, яны на-ходу практыкуюцца ў розных відах спорту і атрымліваюць заслужанае адабрэнне трыбун.

Вялікай калонай прадстаўлена таварыства «Буревестник» — гэта моладзь дзяржгандлю. Работнікі нашых магазінаў вельмі добра робяць практыкаванні на трапецыях.

Над плошчай праносяць вялікую мадэль совецкага павільёна на міжнароднай Парыжскай выстаўцы. Вядомая скульптура, вянчаючая гэты павільён: юнак і дзяўчына ў імкнёным руху наперад. На парадзе гэта скульптура ажыла. Жывая пара, стройны юнак і прыгожая дзяўчына, імкнуцца нібыта ўвысь...

Музыка змаўкае... Здалёк даносіцца рытмічны гук магутнага кроку. З песнямі ўступае на плошчу калона фізкультурнікаў Чырвонай Арміі. Іх сустракаюць бурнымі прывітаннямі. Відовішча гэта выключнае, незабыўнае.

Аголеныя целы, шакаладныя ад роўнага і здаровага загару, сільныя, мускульныя, дышуць свежасцю і здаровай маладосцю. Аголены гладка выбрытыя галовы... Усе як адзін! І ва ўсіх тварах спакойная і вясёлая ўпэўненасць, ва ўсіх вачах жывая іскарка. Яны ідуць быстра, лёгка і свабодна, з песнямі аб радзіме і аб Сталіне, і ў іх руху адчуваецца жалезная, несакрушальная сіла.

Услед за калонамі рабочай моладзі бавуўнянапапяровай прамысловасці, трыкатажнай, грамадзкага харчавання, сярэдняга машынабудаўніцтва, электрастанцый і інш. ідзе калона «Ударніка». Гэта — маладыя педагогі, работнікі сярэдняй і пачатковай школы. Як далёк новы настаўнік, совецкі настаўнік, ад прывычнага старога тыпу дарэволюцыйнага педагога. Чэхаўскі «чалавек у футляры», настаўнік гімназіі, прышпіў адночны ў жах, убачыўшы моладога настаўніка на веласіпедзе. Гэта было непрыстойна! Совецкія маладыя настаўніцы і настаўнікі ідуць сярод рабочай моладзі. Яны павінны быць прыкладам для сваіх вучняў і ў спорце, і ў фізкультуры.

Калона «Комунара» — рабочых шасейна-дарожнага будаўніцтва — астраумна аформіла, сябе як велізарны трактар на гусеніцах.

Шэствіе перарываецца на кароткі час, музыка змаўкае, і плошча напаўняецца серабрыстым звонам тысячы званочкаў. Гэта праходзяць веласіпедысты Масквы.

У калоне «Спартака», праходзячай з выступленнямі па розных відах спорту, звяртае асаблівую ўвагу на сябе каманда футбалістаў, вышэйшая пераможцамі ў спаборніцтве з камандай Краіны Баскаў. Тт. Сталін, Молатаў, члены ЦК і ўрада, публіка ім бурна апладыруе.

Шэствіе калон прадаўжаецца ўжо каля двух гадзін. У тры гадзіны пад гукі фанфар уступае на плошчу «Дынамо». Над галоўным атрадам велічна плыве вялікі сцяг з папулярнейшай у Саюзе літарай — галубым «Д» на белым полі.

Як заўсёды, калона «Дынамо» афармлена з вялікім мастацкім густам. Яе праходжанне праз плошчу — гэта разам і цікавае выступленне выдатных гімнастаў. Па-халу складаюцца піраміды, робіцца практыкаванне ружжамі, лыжнікі бягуць на лыжах, да якіх прыстасаваны ролікі, юныя члены Болшэвскай комуны робяць галавакружальныя прыжкі.

Эфектна афармлена калона будаўнікоў канала Масква-Волга. Праз мастацка зробленую мадэль шлюза праходзяць элегантныя яхты.

Калону «Дынамо» і ўсё шэствіе заключае добра аформіленая група пагранічнікаў. На платформе, дэкарыраванай зеленню, стаяць, ляжаць маладыя байцы нашай пагранаховы. Яны ўважліва ўглядаюцца ў даль. «Вораг не перашагне нашых граніц!» Гэты надпіс і гэта група сведчаць аб тым, што вясёлы і святочны характар фізкультурнага парада нічога агульнага не мае з бясклопатнасцю.

Вялікая дружба народаў

У 3 гадзіны 30 мінут плошча пусцее, аднак ненадоўга. Сотні рэбят, юных піонераў, на сігналу збягаюцца і выстраіваюцца ў рады. Гэтым адкрываецца частка парада, прысвечаная спартыўна-гімнастычным выступленням.

Першымі выступаюць маленькія гімнасты Маскоўскага гарадскога дома юных піонераў. Яны лоўка робяць рытмічныя рухі, быстра перастройваюцца, сярод іх ёсць ужо ўмелыя гімнасты. Бурнае захапленне глядачоў выклікае чырвонаармейская пляска. Танцуюць рэбяты ў чырвонаармейскай форме. Забаўны лоўкія малышы, якія выраблялі з сур'ёзнымі тварамі замыславатыя фігуры трапака.

Затым Красная плошча ператвараецца нібыта ў гіганцкую сцэну Вялікага тэатра. Выступаюць делегацыі саюзных рэспублік. Мы бачылі танцораў некаторых гэтых рэспублік на сцэне. Вядомы іх велізарны поспех. Але гэта былі галоўным чынам прафесіяналы танца, умелыя майстры. Тут перад глядачамі была ў большасці рабочая і селянская моладзь, і майстэрства іх адзіўляла не ў меншай меры.

Першай выступала делегацыя Кіргізкай ССР. Сярод яе былі фізкультурнікі ў звычайных майках, толькі лепш прыбраных, больш яркіх; былі і фізкультурнікі ў нацыянальных касцюмах. Яны паказалі ўмелую рытміку ў рухах і прадставілі нацыянальную барацьбу. Закончылі яны сваё выступленне фігурнай паршыроўкай, перайшоўшай у масавую пляску.

Фізкультурнікі Казахскай ССР выйшлі на плошчу з песняй сарбазаў — казахскіх партызан. Яны паставілі затым масавую гульню кіз-басу, адлюстроўваючы ў рытмічных рухах і ў кляцзы конікатанне.

Пад гукі нацыянальных інструментаў таджыкскія дзяўчаты ў красачных тканінах танцавалі «Аз панджан ман» — народную пляску, поўную прыгожасці і грацыі. Мужчыны паказалі энергічную, характэрную народную гульню Таджыкістана «Чуб бозы».

Здзіўляюча была пляска ўзбекскіх дзяўчат. Гэта была спартыўная пляска, танец-гімнастыка. Дзяўчаты практыкаваліся з блакітнымі шарфамі ў руках, і часамі здавалася, што гэта блакітнае полымя ўспыхвае над плошчай. Прыгожае пачуццё рытма паказалі ўзбекскія юнакі, прарабіўшыя складаныя практыкаванні ў поўным маўчанні, сярод запіхнай плошчы, без музыкі.

У развяваючыхся белых вопратках і чырвоных безрукавках, з белымі цюбетэйкамі на галаве туркменскія фізкультурнікі выканалі заяўленую пляску «Белуджэй» з мечамі.

Абавязковым нумарам у выступленні фізкультурнікаў Усхода была барацьба. Кожны народ упосіў у яе свае асобыя рысы. Але ва ўсіх — гэта любімы від спартыўнай забавы, патрабуючай сілы, лоўкасці, энергіі.

Армянскія дзяўчаты вельмі добра выканалі гімнастычныя практыкаванні з жбанамі і народны танец «Клор-пар». Гімнасты паказалі некалькі складаных нумароў і ў заключэнне пабудавалі піраміду з жывым словам «Сталін».

Вельмі цёпла прынята публіка стройных і прыгожых грузінскіх фізкультурнікаў. Яны прарабілі свае гімнастычныя нумары з выключнай лёгкасцю, весела і ажыўлена. Сярод іх аказаліся першакласныя акрабаты.

Делегацыя Азербайджанскай ССР выканала народны танец «Алма» і рад практыкаванняў з народным гімнастычным спарадам тыпу булавы.

Плошча раптам апустэлася пасля гэтага. Нечакана ўздоўж сцяны, процілеглай трыбунам, узняўся кудрэвы лес. Ён рушыўся, падзяліўся, размясціўся радамі... За кожным дрэвам была дзяўчына ў белай сукенцы з узорчатай вышыўкай. Так выступілі фізкультурнікі Беларускай ССР. Яны паказалі выключную сыгранасць, дакладнасць ва ўсіх рытмічных рухах, рознастайнасць і востраум'е выдумкі. Вельмі добрымі былі практыкаванні з кійкі, поўна гумару і зграбнасці парадзійная гульня ў футбол. У заключэнне беларуская моладзь выканала паэтычны народны танец «лявоніху».

Украінскія фізкультурнікі выканалі некалькі гімнастычных практыкаванняў з абручамі і істужкамі і мужчынскую гімнастычную «зарадку». Нацыянальная характэрнасць была толькі ў тралыньным «гапаку». Добра спелі украінскія фізкультурнікі песню аб Сталіне.

Кароткім, але выразным было выступленне групы гімнастаў профсаюзаў. Іх было да 1.000 чалавек. Яны выбеглі з розных бакоў лёгка і хутка і занялі амаль усю плошчу. У руках іх былі металічныя кіі. Іры дакладных і скорых рухах кіі мігацелі на сонцы, успыхвалі маланкамі. Гэта было эфектнае відовішча і вельмі ўмелае практыкаванне.

Яны ўступілі песцю студэнтам Інстытута фізічнай культуры імя Лесгафта (Ленінград). Гэта ўжо і зараз майстры ўсіх відаў спорту. Масква бачыла не раз іх вывучку, чыстату іх работы, культуру пластычных рухаў, існоўненых сілы і лёгкасці.

Яны паказалі вайсковыя практыкаванні, бег з перашкодамі, рукапашны бой. Гэта здавалася «усамдзеліпшым», — да такой ступені жыва, энергічна, натуральна ішлі практыкаванні, але ўсё гэта была гульня, заснаваная на дакладным і тонкім разліку.

Не адставаў ад Інстытута фізічнай культуры і Маскоўскі абласны тэхнікум, які паказаў умелых гімнастаў на трапецыях і складаных акрабатычных піраміды.

Апошнім выступаў Цэнтральны інстытут фізічнай культуры імя Сталіна. Ён захапіў публіку не толькі масавымі практыкаваннямі выдатнай дакладнасці і спрытнасці. Ён паказаў, апрача таго, выдатных майстроў акрабатыкі. Плошча ператварылася ў арэну цырка, але без спецыфічных цыркавых рысаў. Тут не было ніякага штукарства, але было давядзенае да музыкальнасці майстэрства дакладнага руху. Труднейшыя практыкаванні на турніках, прыжкі, сальтомартале прарабляліся са здзіўляючай чыстатой, з бездаганай лёгкасцю.

У той час, як адны юнакі і дзяўчаты практыкаваліся на спарадах, другія прарабляілі складаныя фігуры на матацыклах: праносіліся праз плошчу, стоячы на галаве, трымаючы дзяўчат на выцягнутых руках, будуючы на ляту піраміды. І затым матацыклісты, вызваліўшыся ад сваіх пасажыраў, прымушалі машыны рабіць прыжкі перад трыбунамі.

Парад скончыўся ў 7 гадзін 15 мінут адначчасовымі практыкаваннямі на 50 гімнастычных спарадах. Гэта была сапраўды сімфонія спрытнасці і прыгожасці чалавечага маладога цела.

Красная плошча апусцела. Публіка разыходзілася. Але свята совецкай моладзі не скончылася. Маладая і радасная энергія яшчэ далёка не была зрасходавана. Наадварот, парад у прысутнасці кіраўнікоў партыі і ўрада, у прысутнасці любімага таварыша Сталіна сам па сабе быў новай крыніцай ажыўлення. І пасля васьмі гадзін прабывання на плошчы, пасля практыкаванняў і танцаў, часля напружання, выклікаванага готым памятным для моладзі днём, удзельнікі парада, зварочваючыся з Краснай плошчы, прадаўжалі пець, весяліцца, танцаваць пры астаноўках... Масквічы цёпла віталі сваіх гасцей, і госці — слаўная моладзь Совецкага Усхода — рады былі паказаць масквічам сваё майстэрства тут-жа, на вуліцах. І доўга не змаўкалі вясёлыя песні на розных мовах, і не разыходзіліся людзі...

(«ПРАВДА»).

Прамова тав. А. В. Косарэва

(Сакратар ЦК ВЛКСМ)

Таварышы моладзь вялікай краіны социялізма!

Таварышы прадстаўнікі гераічнага народу Краіны Баскаў!

Таварышы моладзь прадстаўнікі брацкіх Совецкіх Социялістычных Рэспублік, комсамолкі і комсамольцы!

Сёння мы паказваем нашаму народу, нашай большэвіцкай партыі, нашаму кіраўніку тав. Сталіну, нашаму ўраду працоўных рэзультаты сваёй фізкультурнай і спартыўнай работы. Ніхто ў свеце няма і не створана такіх умоў для выхавання, адукацыі і фізічнага развіцця падрастаючага пакалення, як у нашай совецкай социялістычнай краіне.

У нас расце мужнае, моцнае, магутнае племя маладых барацьбітоў за комунізм, гатовых перамагчы любыя перашкоды і любыя труднасці. Нашы ворагі адчуваюць да совецкай моладзі звярыную нянавісць таму, што совецкая моладзь з'яўляецца сталінскім племенем. Мы ганарымся тым, што намі кіруе вялікая партыя комунізма, выхоўвае і загартоўвае лепшы змагар социялізма — наш вялікі таварыш Сталін.

Клопаты социялістычнай радзімы, клопаты Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў, клопаты нашага народу, нашага ўрада аб нашай моладзі мы поўнасцю апраўдаем, і калі наступіць для нашай социялістычнай бацькаўшчыны суровыя ваенныя часы, моладзь, выхаваная партыяй Леніна—Сталіна, будзе на першых, самых труднейшых участках барацьбы за комунізм.

Совецкая моладзь і надалей пойдзе на шляху таварыша Сталіна. Не зварачваючы з гэтага шляху, мы прыдзем да комунізма.

Совецкая моладзь — гэта вярнейшы рэзерв нашай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Рэзультаты нашай работы вялікія, але наш народ мае права патрабаваць ад сваёй моладзі большага. І вось да гэтага ўсе мы, маладыя людзі нашай краіны, члены ленінскага комсамола, і павінны імкнуцца.

Няхай жыве наша Вялікая Социялістычная Радзіма!

Няхай жыве наш гераічны працоўны народ!

Няхай жыве наша непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве партыя комунізма, партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш выхавацель, кіраўнік і правадыр таварыш Сталін! Ура!

ФІЗКУЛЬТУРНІКІ БЕЛАРУСІ НА МАСКОЎСКІМ ПАРАДЗЕ

Учора делегацыя фізкультурнікаў Беларусі паспяхова выступіла на Краснай плошчы Масквы. 300 студэнтаў тэхнікума фізкультуры бліскуча разыгралі змястоўную інсцэніроўку «Граніца на замку». Таварыш Сталін, члены Палітбюро і ўрада горача апладыравалі беларускім фізкультурнікам. Яркая, простая і тэматычна актуальная інсцэніроўка выклікала захапленне, ухвалу ўсіх удзельнікаў выдатнага фізкультурнага парада краіны социялізма, прадстаўнікоў усіх народаў СССР. 14 ліпеня на стадыёне «Дынамо» тэхнікум разам з прадстаўнікамі ўсіх брацкіх рэспублік у другі раз выступае перад стотысячнай масай працоўных Масквы. Яшчэ некалькі дзён правядуць беларускія ўдзельнікі парада ў Маскве. Усе яны сябе адчуваюць тут вельмі добра. Яны наведаюць канал Волга—Масква, метро, планетарый і інш. месцы сталіцы. 17 ліпеня вернуцца ў Менск.

П. КАВАЛЕЎ.

НАША МАРА ЗБЫЛАСЯ

Пабываць на фізкультурным парадзе ў Маскве, прыняць удзел у дэманстрацыі магутнасці і сілы Совецкага Саюза з'яўлялася марай усіх фізкультурнікаў БССР. І вось мы ў Маскве.

У сваім выступленні мы імкнуліся адлюстраваць тыя спецыфічныя ўмовы, у якіх жыве і працуе беларускі парт. Мы імкнуліся паказаць рост абароназдольнасці нашай краіны, паказаць, што Беларусь з'яўляецца надзейным замком заходніх граніц СССР.

Уражанні, якія мы, удзельнікі парада, атрымалі ў гэты незабываемы сонечны дзень, назаўсёды астануцца ў нашай памяці. Гэты парад, у якім прыняў ўдзел прадстаўнікі саюзных рэспублік, для ўсіх нас мае велізарнае значэнне. Ён дае нам магчымасць пазнаёміцца з усімі рознастайнасцямі фізічнай культуры.

Для тых рэспублік, дзе фізкультура яшчэ мала развіта, прайшоўшы парад будзе велізарным штуршком.

Цяжка перадаць тыя пачуцці, якія ахапілі ўсіх нас, калі мы выйшлі на Красную плошчу, дзе знаходзіліся кіраўнікі партыі і ўрада на чале з таварышам Сталіным. Мы шчаслівы, што збылася наша мара. Мы бачылі, з якой увагай адносяцца кіраўнікі нашай партыі і ўрада да фізкультурнага руху. І гэта ўвага натхняе нас на барацьбу за новыя і новыя дасягнені.

Дырэктар Беларускага тэхнікума фізкультуры

М. СКУПАЎ.

Старшы выкладчык гімнастыкі — тэхнічны кіраўнік выступленняў беларускай делегацыі

А. ГУБАНАЎ.

Калоны фізкультурнікаў праходзяць каля трыбуны.

Афармленне калоны спартыўнага таварыства «Торпеда» на парадзе.

Фото Ф. Кіслова (СФ).

Вялікае ўсенароднае свята

ЦЁПЛАЯ СУСТРЭЧА

12 ліпеня ў Зялёным тэатры парка імя Горкага адбыўся вечар партыйна-комсамольскага і прафесіянальнага актыва г. Менска, прысвечаны сустрэчы з Героямі Совецкага Саюза.

У прэзідыуме сярод мноства зелені і кветак — сакратар ЦК КП(б)Б тав. Дзеніскевіч, старшыня ЦВК БССР тав. Стакун, Герой Совецкага Саюза, удзельнік слаўнай экспедыцыі на Паўночны полюс лётчык Галавін, бортмеханік-ордэнаносец Тераньеў, Герой Совецкага Саюза камбрыг т. Хальзуноў, Герой Совецкага Саюза маёр Арман.

Сакратар гаркома партыі т. Літвін, адкрываючы вечар, вітае герояў Совецкага Саюза ад працоўных горада Менска, якія святкуюць 17-ую гадавіну вызвалення Беларусі ад польскіх акупантаў.

Актыў бурнай авацыяй сустракае з'яўленне на трыбуне Героя Совецкага Саюза лётчыка камбрыга В. С. Хальзунова.

Ён перадае ад слаўных лётчыкаў баявое прывітанне працоўным Беларусі. Ён гаворыць аб тым, хто натхняе на геройскія подвігі ў нашай социялістычнай радзіме, аб вялікім Сталіне, аб яго чулых адносінах да людзей.

На трыбуне Герой Совецкага Саюза палярны лётчык, удзельнік экспедыцыі на Паўночны полюс тав. Галавін. Доўга незмаўкаючымі апладысментамі актыў горача вітае мужнага большэвіка, заваявальніка лёдавых прастораў суровай Арктыкі.

Тав. Галавін падрабязна расказаў аб палёце экспедыцыі на Паўночны полюс, аб даследванні пераможанага большэвікамі Паўночнага полюса.

З вялікай увагай актыў выслухаў расказ тав. Галавіна аб першых днях, праведзеных на дрэйфуючай крыге, аб мітынгу ўдзельнікаў экспедыцыі, аб чырвоным сцягу социялістычнай краіны, узнятым над ільдамі Паўночнага полюса. Наша экспедыцыя пакінула на крыге гераічную чацвёрку, якая працягвае навуковую работу, што прынясе велізарную карысць прагрэсіўнаму чалавецтву.

Чырвонаармеец-пагранічнік т. Балашоў расказаў аб гераічных буднях слаўных дазораў нашых заходніх граніц. Ён гаварыў аб тым, як ён сам затрымаў дыверсанта, які імкнуўся пераправіцца ў нашу краіну на заданню адной з замежных контрразведак. Чырвоныя пагранічнікі з гонарам выконваюць даручэнне свайго народу пільна ахоўваць граніцы Совецкага Саюза ад фашысцкіх лазутчыкаў.

Герой Совецкага Саюза маёр Арман у яркай прамове расказаў аб магутнасці нашай непераможнай Чырвонай Арміі, аб мужных лётчыках і танкістах, якія ў кожную хвіліну гатовы абрушыцца стальной лавінай на ворага, калі ён толькі пасмее ступіць на нашу свяшчэнную і недатыкальную зямлю.

Мы будзем біць ворага, — гаворыць тав. Арман пад бурныя апладысменты прысутнічаючых, — на той тэрыторыі, адкуль ён высуне сваё свіное рыла. Наша Чырвоная Армія — непераможна, бо ёю кіруе вялікая партыя большэвікоў і мудры чалавек, геніяльны правадыр працоўных усяго свету таварыш Сталін.

Сакратар гаркома партыі т. Літвін, закрываючы вечар, запоўніў дарагіх гасцей, што працоўныя сталіцы ордэнаноснай Беларусі будуць умацоўваць абарону нашай краіны, яшчэ лепш працаваць на вытворчасці і па першаму заклику партыі і ўрада станунь у рады слаўных байцоў Чырвонай Арміі, каб разбіць ушчэнт брудныя памыслы фашысцкіх бандытаў.

Пасля афіцыйнай часткі актыва была паказана чырвонаармейская мастацкая самадзейнасць.

Р. Д.
М. А.

СВЯТОЧНЫЯ ДНІ

Наступіла радаснае свята беларускага народу — 17-ая гадавіна вызвалення БССР ад белапалякаў. Вечарам 11 ліпеня ў сталіцы запаліліся гірлянды электраагнёў. Асветленыя імі, над будынкамі прадпрыемстваў і ўстаноў, над дамамі кастрамі палыхалі чырвоныя палотнішчы і сцягі. Горад быў поўны радаснага вяселля, бадзёрых спеваў і музыкі. Не было кутка, дзе-б не весяліўся народ. На пляну перад цудоўным палацам Чырвонай Арміі, па заліўтай святлом Ленінскай вуліцы, у парках —усюды весяліліся і танцавалі. Радасць біла праз край, радасць шчаслівага жыцця над сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

На пляну Волі гарадскі гадзіннік адбіў 12. Поўнач. З Масквы — роднай сталіцы нашай социялістычнай радзімы — данесліся гукі «Інтэрнацыянала». У клубах, тэатрах, на пляцах, парках і садах БССР гэты гімн быў падхоплен. Увесь народ у гэтыя мінуты спяваў яго асабліва ўрачыста. Стрэлка гадзінніка ледзь уздрыгнула і рушыла ў далейшы шлях. БССР уступіла ў свой 18 год радаснага, шчаслівага і свабоднага жыцця. Далёка за поўнач не спынялася вяселле.

Раніпай 12 ліпеня да поўдня ліў праліўны дождж. Пасля гораз, умыты і асвежаны пасля дажджу, зноў ажыў радасным вяселлем. Вуліцы напоўніліся па-святочнаму апранутымі людзьмі. Велізарным бесперапынным патокам яны накіроўваліся ў месцы масавага вяселля.

Святочнае гуляннe адбывалася на пляцах, на вуліцах, у парках сталіцы. На пляну перад Домам Чырвонай Арміі ў плаўным вальсе кружыліся дзесяткі пар. На глаткім асфальце Ленінскай вуліцы велізарным хараводам танцавалі «Лявоніху».

Народ святкаваў слаўную гадавіну.

Н. ГАРНЫ.

ГЕРОІ СОВЕЦКАГА САЮЗА тт. ГАЛАВІН І АРМАН У ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ЛАГЕРАХ

Тав. Галавін — Герой Совецкага Саюза —адзін з слаўнай плеяды адважных заваявальнікаў Паўночнага полюса — у дні свята наведаў чырвонаармейскія лагеры часцей, дзе начальнікамі палітаддзелаў тт. Ханін і Хордас.

Тав. Галавін, сустрэты з выключнай цеплынёй і сардэчнасцю камандзірамі і чырвонаармейцамі, падрабязна расказаў ім аб легендарнай экспедыцыі, арганізаванай і ажыццёўленай большэвікамі. Яго расказы, не раз перарываемыя апладысментамі, выслухоўваліся з вялікай увагай. Велізарныя аўдыторыі слухачоў сядзелі, баючыся шалахнуцца, баючыся недачуць слова з простага, бясхітраснага расказа аб слаўных справах людзей сталінскай загартоўкі, ажыццявіўшых тое, аб чым вякамі марылі лепшыя людзі чалавецтва.

Пытанні, заданыя тав. Галавіну, даказвалі як уважліва сочаць за подвігамі сталінскіх пітомцаў чырвонаармейцы і камандзіры.

Герой Совецкага Саюза тав. Арман таксама наведаў лагеры, дзе выступіў з цікавым расказам для чырвонаармейцаў і камандзіраў.

П. ВАЛЬД.

ПА ГАРАДАХ І РАЁНАХ БССР

МАЗЫР. 17-я гадавіна вызвалення Совецкай Беларусі ад белапалякаў была адзначана працоўнымі Мазыра як вялікае народнае свята. 17 гадоў Мазыр — цэнтр Совецкага Палесся — жыве свабодна і шчасліва. Вось чаму так радасна і весела выглядалі ў дзень свята твары працоўных, якія, апрануўшыся ў лепшае адзенне, запоўнілі гарадскія паркі. Асабліва шматлюдна было ў парку, што засаджан вясной гэтага года на беразе Прыпяці. Гарадская моладзь весяліласа на танцавальнай пляцоўцы, каталася па рэчцы на лодках, праводзіла спаборніцтвы па плаванню. Увечары на летняй эстрадзе тут-жа ў парку для працоўных сіламі акруговага калгаснага тэатра быў дан спектакль. Была пастаўлена п'еса «Рыбакі» Янкі Купалы.

Вясёлым і задорыстым смехам дзетвары напоўнен быў дзіцячы парк, адкрыццё якога адбылося ў дзень свята. Падобна матылькам пархалі жыццерадасныя дзеці ад аднаго атракцыёна да другога. У парку таксама быў дан самадзейны канцэрт сіламі саміх дзяцей.

У асоавіяхімаўскім лагеры праведзены стралковыя спаборніцтвы па стральбе з дробнакаліберных вінтовак на адлегласць 50 метраў. Пяршынства ў спаборніцтве заняла каманда фанернага завода «Чырвоны Кастрычнік». Рабочыя завода прадэманстравалі свае поспехі ў павышэнні ваенных ведаў, сваю гатоўнасць біць ворага яшчэ больш трапна, чым у дні вызвалення Беларусі ад белапалякаў.

ФРАЛОЎ.

***

МАГІЛЕЎ. З самай раніцы 12 ліпеня працоўныя Магілева на дзесятках аўтамашын накіраваліся за горад — у прыгожую мясцовасць Печэрск. Сюды, на масоўку, прысвечаную 17-ай гадавіне вызвалення Беларусі ад белапалякаў, сабралася некалькі тысяч чалавек. Лес агалосіўся музыкай і песнямі. Тысячы людзей прынялі ўдзел у масавых гульнях.

На валейбольных пляцоўках, якіх у лесе было каля 20, фізкультурнікі фабрык і заводаў спаборнічалі ў таварыскіх сустрэчах.

Пасля мітынга на адкрытай сцэне артысты тэатра музкамедыі далі канцэрт. Лепшыя фізкультурнікі горада паказалі рад прыгожых гімнастычных практыкаванняў.

***

БАБРУЙСК. З пачуццём гонару за сваю квітнеючую краіну святкавалі працоўныя Бабруйска 17-ую гадавіну вызвалення Беларусі ад белапалякаў. 11 ліпеня ў дачнай мясцовасці Яловікі была наладжана агульнагарадская масоўка.

На мітынгу выступіў знатны чалавек Бабруйшчыны — член ЦВК БССР, начальнік лесапаха № 1 дрэваапрацоўчага камбіната тав. Гладышаў. Ён гаварыў аб выдатным жыцці вызваленага беларускага народу, які ўпершыню толькі дзякуючы социялістычнай Кастрычніцкай рэволюцыі атрымаў сваю дзяржаўнасць, аб бліскучых перамогах БССР, здабытых пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры асабістых клопатах таварыша Сталіна.

Мітынг скончан. Тут-жа ў лесе адбыліся масавыя гульні і танцы. Выступілі дзесяткі гурткоў мастацкай самадзейнасці. На масоўцы выступіла брыгада акцёраў тэатра МОСПС, гастролі якога праходзілі ў Бабруйску. Да позняга вечара лес агалашаўся музыкай, песнямі радасці і перамог.

Піонерскія лагеры ў Драздах. На першым плане: піонерка Лілія Грыгоніс і Нэля По ляк. Фото С. Грыма.

КОННА-СПАРТЫЎНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ КАВАЛЕРЫЙСКІХ ЧАСЦЕЙ БВА

Знамянальную дату — 17-годдзе вызвалення БССР ад белапольскіх акупантаў — кавалерыйскія часці Беларускай ваеннай акругі адзначылі вялікімі конна-спартыўнымі спаборніцтвамі. Спаборніцтвы прыпягнулі ўвагу шматлікіх глядачоў — трыбуны запоўнілі працоўныя горада, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі.

У пачатку шостай гадзіны пад гукі аркестра на зялёнае поле Менскага іпадрома выехала 12 коннікаў Н-скага кавалерыйскага палка. У такт музыцы коні выконваюць розныя фігуры школы вышэйшай язды. Фігурная язда змяняецца павышаным конкур-іпікам, у якім удзельнічаюць дзве групы коннікаў.

У бар'ерных скачках на 2 кілометры прыняла ўдзел 12 коннікаў. Узмах сцяжка старшёра, і чатыры коннікі зрываюцца з месц. У імклівым галопе яны нясуцца па кілометраваму колу іпадрома. «Хто прыдзе першым?» — гадаюць глядачы. Перад самым фінішам наперад вырываецца старшына Скрыпін на кабыліцы «Азія». Яго час 2 мін. 47 сек. Але ў трэцім заезлзе абсалютнае пяршынства ў бар'ерных скачках дастаецца міліцыянеру Паклонскаму (конь «Знойны»). 2 кілометры ён праязджае за 2 мін. 44,2 сек.

У скачках з перашкодамі на 3 кілометры, так званым стыпль-чэз пяршынства заваёўвае міліцыянер Дуванаў (конь «Грэх»), на другім месцы старшы лейтэнант Машкоў (конь «Балет»). Час першага 4 мін. 17 сек., другога — 4 мін. 34 сек.

Багатая і рознастайная праграма конна-спартыўных спаборніцтваў заканчваецца групавой фігурнай яздой і гульнёй у пушбол. Чырвоныя кавалерысты прадэманстравалі перад глядачамі сілу і мужнасць, сваю гатоўнасць заўсёды абстаяць граніцы нашай любімай радзімы.

Але трэба адзначыць, што шматлікія глядачы Менска, якія цікавіліся праводзімымі спаборніцтвамі, не маглі папасці на іпадром. І тыя, што прышлі сюды, не ўсе маглі сядзець. Менскі іпадром не прыстасован да правядзення вялікіх конна-спартыўных спаборніцтваў. Сталіцы БССР пара мець узорны, добра абсталяваны іпадром.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

ПІОНЕРСКІ КАСЦЁР

Сонца схавалася за верхавіні вялікага ландшаўтнага саду, які акаляе піонерскі лагер у Волкавічах. 203 піонеры з музыкай і спевамі выйшлі стройнымі радамі з лагера ў бліжэйшы лес на свой піонерскі касцёр. Выбраному месцу рукамі піонераў прыдан надзвычай удала сапраўды захапляючы выгляд.

Удзельнік барацьбы за вызваленне Менска і Беларусі ад белапольскіх акупантаў, стары чэкіст тав. Луганскі расказвае піонерам аб жудасных зверствах белапалякаў, аб пакутах рабочых і сялян Беларусі ў часе нямецкай і польскай акупацый. Далей ён расказвае як беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры брацкай дапамозе рускага пролетарыята разграміў акупантаў і будуе сваё шчаслівае жыццё.

Дзве сотні рэбят напружана ловяць кожнае слова расказчыка, толькі трэск галінак на кастры парушае начную цішыню, ды часам выбух апладысментаў — гэта расказчык апавядае аб велізарнейшай рабоце, праведзенай тт. Сталіным і Серго Орджанікідзе па арганізацыі разгрому белапольскіх акупантаў. Далёка па лесе нясуцца словы прывітання і ўдзячнасці вялікаму Сталіну за радаснае, шчаслівае жыццё.

Пасля гутаркі піонеры паказалі сваю багатую самадзейнасць. Мілагучная музыка, бадзёрыя, дружныя песні, майстэрскія дэкламацыі і вясёлыя танцы шчаслівай дзетвары — усё гэта яшчэ і яшчэ раз красамоўна гаварыла, што кроў, пралітая за вызваленне Беларусі, не прапала дарам. На совецкай зямлі растуць юныя таленты, шчырыя патрыёты совецкай радзімы, якія ніколі не дапусцяць ні адной паганай нагі акупанта на вольную совецкую зямлю.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

12 ліпеня на мадрыдскім фронце мяцежнікі прадпрымалі адчаяныя спробы зноў заняць Вільянуэва дэль Пардыльо (на паўночны захад ад Мадрыда). На працягу ўсяго дня адбываліся тут лютыя баі. Рэспубліканскія войскі зрабілі бліскучую контратаку, адбіўшы ўсе спробы праціўніка, які панёс сур'ёзныя страты. Мяцежнікі былі адкінуты не толькі ад Вільянуэва дэль Пардыльо, але і ад пазіцый, размешчаных у ваколіцах гэтай вёскі і пануючых над ёй.

За час з 7 ліпеня рэспубліканскія войскі прасунуліся на 16 клм. углыб размяшчэння мяцежнікаў.

Як перадае агенцтва Гавас, 12 ліпеня рэспубліканская авіяцыя разгарнула выключна актыўную дзейнасць. Рэспубліканскія самалёты бамбардыравалі ў розных пунктах пазіцыі мяцежнікаў і збілі 13 непрыяцельскіх самалётаў. Рэспубліканцы страцілі 3 самалёты.

УСХОДНІ (АРАГОНСКІ) ФРОНТ

Вёска Альбарасін (на паўночны захад ад Тэруэля) поўнасцю акружана рэспубліканцамі і ў ёй ідуць вулічныя баі. Мяцежнікам не ўдалося зноў заняць страчаныя пазіцыі, не гледзячы на атрыманыя значныя падмацаванні мараканскімі часцямі.

ФРАНЦЫЯ ЗНІМАЕ КАНТРОЛЬ НА ГРАНІЦЫ З ІСПАНІЯЙ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 12 ліпеня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, французскі пасол у Лондане Корбен паведаміў старшыні Камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі Плімуту, што міжнародны кантроль на франка-іспанскай граніцы будзе знят 13 ліпеня ў поўдзень.

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 12 ліпеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Гавас, у аўтарытэтных французскіх колах заявілі, у сувязі з зняццем міжнароднага кантролю на франка-іспанскай граніцы, што абавязацельствы французскага ўрада, вынікаючыя з пагаднення аб неўмяшанні, астаюцца ў сіле.

ПАДЗЕІ У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ПАЎТОРНЫЯ АТАКІ ЯПОНСКІХ ВОЙСК

БЭЙПІН (б. сталіца Кітая), 12 ліпеня. (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Рэйтэр, японскія войскі колькасцю каля 2 тыс. чал. 10 ліпеня ўноў занялі значны раён на поўдзень ад Бэйпіна. Лінія японскіх войск цягнецца ад Лунвамяо, блізка Люкоуцзяо, да пункта ў 7 км. ад Бэйпіна.

Агенцтва Сентрал Ньюс указвае, што адзін з японскіх вайсковых паязлоў знаходзіцца на шляху ў Люкоуцзяо, два паязды прайшлі Пяньцзінь. Усяго з Мукдэна (Манчжоу-Го) на поўдзень адпраўлена 11 эшалонаў. Апрача войск, паязды гружаны танкамі, браневікамі і артылерыяй.

Паведамленні з раёна баявых дзеянняў гаворыць аб тым, што 10 ліпеня вечарам была акружана і знішчана рота японскіх войск, атакаваўшых у 9 гадзін вечара ўзвышша, якое знаходзіцца на поўночны захад ад Люкоуцзяо. У гадзіну ночы атака была паўторана 500 японцамі пад прыкрыццём моцнага артылерыйскага агню, прымусіўшага кітайцаў адысці ад гэтага пункта. Некалькі спроб японскіх войск фарсаваць на працягу ночы раку Юнцінхэ і зайсці ў тыл Люкоуцзяо былі поўнасцю адбіты. Сражанне спынілася ў 5 гадзін раніцы, і японцы адступілі.

11 ліпеня днём японцы аднавілі атаку Люкоуцзяо, але неўзабаве яе спынілі.

***

БЭЙПІН (б. сталіца Кітая), 12 ліпеня. (ТАСС). 11 ліпеня паміж 6—8 гадзінамі ўвечары адбылася сустрэча кітайскіх і японскіх ваенных уладаў, пасля якой мэр Бэйпіна (галава гарадскога самакіраўніцтва) Пэйнь-Да-чун заявіў, што дасягнута пагадненне, паводле якога абодва бакі адводзяць свае войскі на пазіцыі, якія займаліся імі да інцыдэнта і кітайскія войскі, такім чынам, астаюцца ў Люкоуцзяо.

Японцы, як відаць, імкнуліся толькі выйграць час з тым, каб захаваць за сабой стратэгічна важны раён Фынтай-Лунвамяо ад палыходу падмацаванняў. Гэта пацвердзілася далейшымі падзеямі. Начныя баі аднавіліся не толькі ля Люкоуцзяо, але і ў раёне на поўдзень ад Фінтая па Бэйпін — Цянь-цзіньскай чыгунцы.

Карэспандэнт агенцтва Рэйтэр перадае, што японцы прад'явілі кітайскім уладам чатыры патрабаванні: 1) эвакуацыя кітайскіх войск з раёна Люкоуцзяо, 2) пакаранне вінаватых, 3) падаўленне антыяпонскага руху ў Паўночным Кітаі і 4) правядзенне антыкомуністычных мерапрыемстваў.

***

БЭЙПІН, 13 ліпеня (БЕЛТА). Вечарам японскія войскі пачалі наступленне з Дапзіньцуня на Цайшэнь-Хяо, што на адлегласці каля 3 клм. ад Бэйпіна. Гэта паказвае, што японцы ўпарта імкнуцца расшырыць занятую імі тэрыторыю і пасыпці ўсутыч да сцен Бэйпіна. Пасля вінтовачнай, кулямётнай і артылерыйскай перастрэлкі японцы былі адкінуты, але стральба ў ваколіцах Бэйпіна цягнулася да раніцы.

Учора ўвечары каля ўсходніх варот Бэйпіна з'явіліся 10 японскіх танкаў, 7 гармат і 40 грузавікоў з японскімі салдатамі, прыбыўшымі з Губэйкоу (праход у Вялікай кітайскай сцяне на граніцы з Жэхэ).

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА ВАРАШЫЛАЎСКАГА РАЁНА

14 ліпеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Летняга закрытага тэатра парка імя Максіма Горкага (б. «Профінтэрн») адбудзецца сход партыйнага актыва Варашылаўскага раёна. На абвестцы—даклад тав. Хархорына на тэму: «Аб шкодніцка-шпіёнскай рабоце замежнай контрразведкі».

Білеты атрымаць у райкоме КП(б)Б.

Сакратар Варашылаўскага РК КП(б)Б КАВАЛЁЎ.

М. М. ГРОМАЎ
Герой Совецкага Саюза

СТАЛІНСКАЯ ТРАСА

ройдзем паміж Дамітравым і Загорскам, перасячэм Волгу, пакінем ззаду Чарапавец і над лясамі, балотамі і тундрай пойдзем да берагу Белага мора.

Палярныя станцыі на Новай Зямлі і востраве Рудольфа будуць забяспечваць нас метэаралагічнымі весткамі, дапамогуць арыентавацца ў нашым месцазнаходжанні і прытрымліваецца правільнага курсу.

Радыёмаякі на мысе Жаланія (Новая Зямля) і востраве Рудольфа (Зямля Францыа-Іосіфа) будуць служыць праводзячымі вехамі на гэтым участку.

Да нядаўняга часу ад вострава Рудольфа, крайняга пункту цвёрдай зямлі на Поўначы ў гэтым раёне, на тысячы кілометраў да ўзбярэжжа Канады не было ні метэастанцый, ні нагул людзей.

Цяпер цэнтр Палярнага басейна «заселен». Чатыры гераічныя зімоўшчыкі — Папанін, Крэнкель, Фёдараў і Ширшоў—робяць рознастайную навуковую работу на дрэйфуючай крыге ў раёне полюса. З раёна, аб якім сіноптыкі рабілі тысячы здагадкі, мы атрымаем у дарозе дакладныя весткі аб надвор'і. Велаючы, што наперадзе знаходзяцца совецкія людзі, мы з большай упэўненасцю павядзем над полюсам нашу машыну.

З 3.000 кілометраў, што аддзяляюць востраў Рудольфа ад берагоў Канады, дзве трэці прыпадае на ўчастак, што ляжыць за полюсам. Гэта — самая трудная частка шляху. Бязмежны акіян, пакрыты ільдамі, найменш даследваны іменна на гэтай «амерыканскай старане».

Расказаць што-небудзь істотнае аб гэтым участку ад полюса да берагоў Канады можна будзе толькі пасля пералёту. З астравоў, размешчаных блізка ад берагоў Канады, на трасе знаходзяцца востраў Патрыка і Зямля Бэнкса. Аб іх таксама ёсць мала вестак.

Не трэба думаць, што дасягнуўшы паўночных берагоў Канады, мы можам ужо лічыць сябе ў Паўночнай Амерыцы. Самасупакойвацца рана! Наперадзе яшчэ доўгі і цяжкі шлях. Трэба перасекчы ўсю Канаду і Скалістыя горы, вышыня якіх дасягае на трасе 4.000 метраў і больш.

Гаручага ў нас — на 13 тысяч кілометраў нармальнага палёту, але на практыцы даказана, што ў такіх доўгіх палётах да чвэрці запасу гаручага затрачваецца на адолеенне розных перашкод. Лішняе гаручае паядаецца сустрэчным ветрам. Воблачнасць прымушае ісці ўверх. Пры абходзе пыклона даводзіцца рабіць крук і т. д.

V.

Да гэтага пералёту мы ў поўнай меры гатовы. З прычыны маёй хваробы мы некалькі спазніліся з падрыхтоўкай, але напружанай работай у апошнія дні нам удалося нагнаць многа часу. Воля экіпажа нашага самалёта накіравана да адной мэты — выканаць заданне, устанавіць і замацаваць транспалярную сувязь двух вялікіх краін.

Наш палёт уяўляе складаную задачу, для вырашэння якой прыходзіцца ўлічваць самыя рознастайныя акалічнасці. Ужо самы першы крок — адрыў машыны ад аэрадрома — патрабуе складанага папярэдняга разліку на падставе доўгіх папярэдніх выпрабоўванняў. Трэба ўлічыць, наколькі можна загрузіць машыну, які прабег яна зробіць і т. д. Разбег па спецыяльнай дарожцы патрабуе вялікага ўмення лётчыка.

Мяркуем, што на некаторых участках (над горамі і пры сустрэчы з воблачнасцю) давядзецца ісці ўверх. Таму мы ўзялі з сабой дастатковы запас кіслароду.

Вядзенне самалёта на працягу больш чым двух сутак без пасадкі патрабуе вялікай вытрыманасці і вынослівасці ад экіпажа. Мы не баімся і гэтага. Мой палёт на працягу 75 гадзін па крывой, калі быў перакрыт сусветны рэкорд дальнасці, даў мне вялікі вопыт. Ён будзе ўлічан цяпер.

Чаго мы чакаем ад пералёту? У нас няма строга намечанага канечнага пункту. Мы будзем ляпець, наколькі хопіць запасу бензіну і паколькі будзе спрыяць надвор'е. Наша задача — замацаваць рэзультат Чкалава, Байдукова і Белякова.

Наш пералёт паказа, што дасягненне Чкалава, Байдукова і Белякова не выпадкова, а з'яўляецца паказальнікам ўзроўню совецкай авіяцыйнай тэхнікі і падрыхтаванасці совецкіх лётных кадраў. Машына «АНТ-25», выпушчаная некалькі год назад,—далёка не апошняе слова совецкай авіяцыйнай тэхнікі. На аснове вынікаў рашэння праблемы дальнасці палёту і даследвання канструкцыі «АНТ-25» нашы заводы могуць пабудаваць машыну з дальнасцю да 25 тысяч кілометраў з зялёкай скорасцю.

Пералёты праз полюс у Амерыку — толькі чарговая ступень у бесперапынкай рабоце совецкіх лётчыкаў, якія не спыняцца на гэтым, а пойдуць яшчэ далей, хутчэй і вышэй.

Пералёт дасць вялікі вопыт экіпажу. Мы пастараемся выкарыстаць яго для новых перамог совецкай авіяцыі. («Праўда»).

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
МАЛЕНЬКАЯ МАМА

Дзіцячы гукавы кінотэатр
ЮНАСЦЬ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ДАЧКА ПАРТЫЗАНА

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ЗОРЫ ПАРЫЖА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
Ад 13 ліпеня
выдатны мастацкі гукавы фільм
ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ
у 8 частках
штодзённа 4 сеансы.
Каса — з 4 г. дня.

ДЗЯРЖЦЫРК
(Парк імя Горкага, тел. 22-725).
СЕННЯ
ВЯЛІКАЕ цыркавое
прадстаўленне ў 3-х аддзяленнях.
Заслужаны артыст рэспублікі
Віталій ЛАЗАРЭНКА
Гастролі дрэсіроўшчыцы
МОРСКІХ ЛЬВОЎ
Тамары БРОК
Пачатак у 9 гадзін веч.
Каса з 12—2 і з 5 гадз. веч.

Уп. Галоўлітбела № А—2419. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 83. Б., К., С.